СЕМ ФАКТАЎ ПРА ВЫБАРЫ Ў ВЯЛІКАБРЫТАНІІ 13




«ПАРЫЖАНЕ» МАСТАЧКІ АЛЕСІ СКАРАБАГАТАЙ 15

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 СНЕЖНЯ 2019 г. СУБОТА № 238 (29105)

# НАША МЕДЫЦЫНА МОЖА ЎСЁ

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў пра гэта з усёй адказнасцю падчас сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў медыцынскага профілю

Так, хоць насамрэч кіраўнік дзяржавы больш за палову дня ўчора знаходзіўся ў Мінску ў адной з аўдыторый Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, чулі яго і задавалі пытанні таксама з аўдыторый Гомельскага, Віцебскага, Гродзенскага медуніверсітэтаў па відэасувязі. Удзельнікаў сустрэчы было каля трох тысяч, і сама яна атрымалася досыць насычаная і пазітыўная. Пра праблемы, пра чуллівыя пытанні на ёй таксама гаварылі шчыра і адкрыта, што характэрна для падобных сустрэч з удзелам Прэзідэнта.

### Дзяржава дапаможа з жыллём. Не толькі ўрачам

Але спачатку была кароткая і канкрэтная размова з профільным міністрам і рэктарам, якія разам з вышэйшымі службовымі асобамі краіны сустракалі кіраўніка дзяржавы на ўваходзе ў галоўны корпус БДМУ. Міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік паведаміў, што ў Беларусі стабілізаваны лічбы прыёму, забяспечаны конкурс пры паступленні ў медыцынскія ВНУ — за кошт бюджэтных месцаў мэтавай падрыхтоўкі. За апошнія дзесяць гадоў іх колькасць павялічана ў 2,5 раза. Пасля выпуску менш за адзін працэнт выпускнікоў адмовіліся ад выканання дамовы. Гэта значыць, што студэнты-медыкі свядома выбіраюць прафесію.

Замацаванасць маладых спецыялістаў на першым рабочым месцы пасля абавязковай двухгадовай адпрацоўкі складае 83,4 працэнта.

У размове з членамі ўрада Прэзідэнт закрануў праблему міграцыі медыкаў. Летась па адпаведныя дакументы на работу за мяжой звярнуліся 158 спецыялістаў, паведаміў міністр, пры гэтым 40 урачоў вярнуліся ў Беларусь.

«Калі ёсць праблемы, іх трэба разглядзець ва ўрадзе і ўнесці прапановы па забеспячэнні перш за ўсё жыллём, — адрэагаваў кіраўнік дзяржавы. — Галоўнае — гэта жыллё, і ў Бараўлянах, як я гэта ўспрымаю, мы, здаецца, намацалі шлях, якім можна пайсці. Слухайце, гэта цудоўны дом, асабліва для маладых людзей. Жалезабетонна трэба давесці заданне на пару-тройку гадоў і выканаць: пабудаваць такія дамы. За паўгода можна «наштампаваць» гэтых кватэр тысячы штук».

Размова — пра сучасны, вельмі камфортны інтэрнат сямейнага тыпу для медыкаў, які ў канцы кастрычніка кіраўнік дзяржавы адкрываў у Бараўлянах. У такім выпадку, падкрэсліў Прэзідэнт, грамадзяне будуць разумець, што дзяржава, нават пры аднолькавым узроўні зарплаты, дапаможа ім з жыллём. Выкананне гэтага патрабавання павінна пачацца ўжо налета.

У тым, што медыкі шукаюць «лепшай долі», кіраўнік дзяржавы бачыць і добры бок. Людзі ўпэўніваюцца: хораша там, дзе нас няма. А вяртаючыся, астуджаюць галовы патэнцыйных працоўных мігрантаў.

«Ад урача патрабуем самаадданасці, каб ён ратаваў людзей. Ён не можа жыць на вуліцы. Гэта асаблівая прафесія. Як і настаўнік, які мусіць нашаму дзіцяці ўкласці ў мазгі тое, што ўвогуле немагчыма. Мы ад яго гэтага патрабуем, а што ўзамен? Таму галоўнае для людзей — гэта жыллё. Калі будзе жыллё, назаўсёды знікне гэтая праблема з адтокам спецыялістаў», — упэўнены Прэзідэнт. Задачу можна вырашыць за некалькі гадоў, калі сканцэнтравацца на ёй, не сумняваецца ён.

Рэктар БДМУ Анатоль Сікорскі паведаміў, што праз два гады ў медуніверсітэце ўзнікне праблема размяшчэння замежных студэнтаў. «Калі гэта прыносіць грошы, не трэба палацы будаваць, трэба пабудаваць ім вучэбна-лабараторны корпус і інтэрнат дадаткова», — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка.

### Прыярытэт — здаровыя людзі

У размове са студэнтамі і выкладчыкамі Аляксандр Лукашэнка перш за ўсё адзначыў, што менавіта ўрачы сярод мноства іншых прафесій шанаваліся як самыя запатрабаваныя спецыялісты ва ўсіх народаў і ва ўсе часы. «Гэта паважаная і высакародная праца. Але і адказнасць на вашых плячах велізарная, бо кошт памылкі — чалавечае жыццё. Усвядоміць гэта — і сэрцам, і розумам — неабходна ўжо ў момант выбару сваёй прафесійнай будучыні», — справядліва заўважыў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Фота БелТА.

## КОРАТКА

**• Стыпендыі спецфонду Прэзідэнта прызначаны 187 студэнтам і курсантам.**

• Базавая велічыня з першага студзеня складзе 27 рублёў.

**• У Гомелі плануюць стварыць пісьменніцкую студыю, куды будуць запрашаць адзінокіх пажылых гараджан падзяліцца жыццёвымі гісторыямі.**

• Распрацоўку мабільнай праграмы МУС плануецца завяршыць да красавіка 2020 года.

**• У Пухавіцкім раёне скралі больш за 500 метраў вузкакалейкі.**

# КРАІНА КНІГ

**Учора ў выставачнай зале Нацыянальнай бібліятэкі стартаваў праект «Кнігі Беларусі. Год 2019». Яго арганізатарам выступіла Міністэрства інфармацыі сумесна з Нацыянальнай кніжнай палатай і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Гэты год для айчыннага кнігавыдання стаў вельмі плённым: больш за 520 суб'ектаў кнігавыдання, дзякуючы якім сёлета выдадзена звыш 9 тысяч кніг агульным тыражом больш за 20 мільёнаў экзэмпляраў. На выстаўцы прадстаўлены менавіта найлепшыя кнігі 2019 года.**

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У нашага выдавецкага дома на выстаўцы быў асобны стэнд.

— Сённяшняя сустрэча — гэта даніна павагі нашым майстрам прыгожага пісьменства, літаратарам, кнігавыдаўцам і ўсім тым людзям, якія робяць значны ўнёсак у развіццё айчыннай літаратуры і культуры ў цэлым. Прэзідэнт нашай краіны падкрэслівае, што культура — гэта падмурак, на якім фарміруецца і развіваецца нацыя. І якраз такі кніжнае слова, слова пісьменніка займае ў гэтым няпростым працэсе адметнае месца. Таму вельмі важна, у тым ліку і на дзяржаўным узроўні, падтрымліваць кнігавыдавецкую справу, спрыяць яе пашырэнню, ствараць належныя ўмовы для папулярызацыі кніжнага чытання, — адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — І трэба сказаць, што беларускую кнігу паважаюць і ведаюць не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Пра гэта яскрава сведчаць вынікі міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» краін СНД, дзе сярод дзяржаў Садружнасці па колькасці ўзнагарод за 16 гадоў яго правядзення Беларусь займае першае месца. Гэта стала магчыма дзякуючы руплівай працы вялікай колькасці пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2020 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# НАША МЕДЫЦЫНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што перад айчыннай медыцынай стаіць найважнейшая задача — павелічэнне працягласці і павышэнне якасці жыцця беларусаў. Гэта адзін з асноватворных прыярытэтаў нацыянальнай палітыкі дзяржавы.

Беларуская ахова здароўя, па словах Аляксандра Лукашэнкі, дасягнула значных поспехаў у распрацоўцы перспектыўных метадаў прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння. Асвойваюцца самыя перадавыя тэхналогіі, ствараюцца новыя лекавыя прэпараты. І за ўсімі гэтымі дасягненнямі стаяць канкрэтныя людзі.

«Найбольш каштоўны і значны рэсурс усёй сістэмы — медыцынскія кадры, — падкрэсліў ён. — Я цвёрда перакананы, што падрыхтоўка высокакваліфікаваных і канкурэнтаздольных спецыялістаў — першая з найважнейшых задач айчыннай аховы здароўя».

Таму вельмі важна забяспечыць кансультаванне і падтрымку моладзі не толькі пры выбары спецыяльнасці, але і падчас станаўлення ў прафесіі.

Прэзідэнт паведаміў, што для пераадолення дэфіцыту медыцынскіх кадраў набор у профільныя ВНУ павялічаны на 200 бюджэтных месцаў, дасягнуты максімальны працэнт паступлення на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі.

«Але і ў далейшым профільным міністэрствам неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на фарміраванне колькасці месцаў для навучання па патрэбных спецыяльнасцях і прымаць рашэнні з улікам патрэб і перспектыўнага плана развіцця кожнага рэгіёна, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — І не забываць пра замежнікаў, яны хочуць у нас вучыцца... Іх дзяржавы плацяць вялізныя грошы за вучобу ў нас».

Сістэма медыцынскай адукацыі, якая склалася ў Беларусі, — гэта сплаў багатых традыцый, навуковай асновы і вялікага практычнага вопыту, адзначыў кіраўнік дзяржавы. А індывідуальны падыход да кожнага студэнта, высокі ўзровень выкладання, у тым ліку на замежных мовах, забяспечваюць высокі міжнародны рэйтынг айчынных медыцынскіх універсітэтаў. Сёння ў гэтых ВНУ навучаецца звыш 20 тысяч студэнтаў, з іх больш за чатыры тысячы — замежнікі з 71 краіны свету. Аб'ём экспарту адукацыйных паслуг сістэмы Міністэрства аховы здароўя штогод расце і цяпер складае траціну ад усіх адукацыйных паслуг па краіне.

«Аднак мы не павінны самазаспакойвацца і спачываць на лаўрах, — дадаў беларускі лідар. — Трэба развівацца».

## Універсітэцкія клінікі — ужо даўно не заўтрашні дзень

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што адна з асноўных праблем, якую не так даўно ўздымалі выпускнікі-медыкі, — гэта высокі ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі і недастатковае валоданне практычнымі навыкамі будучай прафесіі. «Я глыбока перакананы: каб падрыхтаваць дасведчанага ўрача-спецыяліста, неабходна камбінаваць класічныя выкладчыцкія методыкі і перадавыя тэхналогіі навучання», — сказаў ён.

У апошнія гады праведзена мадэрнізацыя сістэмы медыцынскай адукацыі. Створана сістэма практыка-арыентаванага навучання. «Мы засвоілі новыя адукацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі. Электронны журнал, які дазваляе выкладчыку і бацькам кантраляваць работу студэнта. Сучасныя імітатары пацыентаў, камп'ютарныя праграмы і трэнажоры, з дапамогай якіх можна адпрацаваць неабходныя ўрачу навыкі, — пералічыў Аляксандр Лукашэнка. — І ўсё гэта без рызыкі для жыцця канкрэтнага хворага. Такія трэнажоры-сімулятары дапамагаюць не толькі студэнтам, але і маладым практыкуючым спецыялістам хутчэй павысіць кваліфікацыю. Таму цэнтры практычнага навучання павінны і далей аснашчацца перадавым абсталяваннем. І ў цэлым матэрыяльная база медыцынскіх ВНУ павінна быць добрая і самая сучасная».

Прэзідэнт паўтарыў свой тэзіс аб неабходнасці інтэграцыі адукацыі, навукі і практычнай дзейнасці. За мяжой гэтая праблема вырашана стварэннем універсітэцкіх клінік, сказаў ён. Іх высокую эфектыўнасць пацвярджае вопыт многіх заходнееўрапейскіх дзяржаў.

«Па маім даручэнні Міністэрства аховы здароўя адпрацоўвае пілотны праект па стварэнні ўніверсітэцкай клінікі на базе Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы, — паведаміў Аляксандр Лукашэнка. — Мы разлічваем, што стварэнне новага фармату кааперацыі медыцынскай практыкі і адукацыі дапаможа забяспечыць больш актыўны ўдзел практыкуючых урачоў у адукацыйным працэсе і эфектыўна выкарыстоўваць патэнцыял выкладчыкаў універсітэта».

І практыкуючы ўрач, і выкладчык маюць свае перавагі і недахопы, але калі аб'яднаць перавагі, студэнт як спажывец ведаў атрымае, на думку Прэзідэнта, тое, што трэба. «Мы толькі што абмяркоўвалі гэтае пытанне, і я даручыў і міністру, і ўраду стварыць базавыя клінікі для медыцынскіх ВНУ цягам трох гадоў», — паведаміў ён.

Тэрмін у тры гады не з'яўляецца непахісным, гэта трэба пралічыць. Галоўнае — мець такую мэту.

Аляксандр Лукашэнка звязаў гэта пытанне і з праблемай адтоку кадраў. Аднак, па яго словах, за апошняй хваляецца вялікая палітыка, бо часцей за ўсё едуць у Польшчу і Літву. «Цяпер бурна мусіруецца гэтае пытанне... Каб вас прыцягнуць туды, маўляў, шэнген, адзіная прастора... — звярнуўся Прэзідэнт да сваіх слухачоў. — Разгойдваецца наша грамадства, каб падштурхнуць вас да выезду».

Колькасць урачоў, якія летась з'ехалі ў іншыя краіны, нібыта невялікая, пры гэтым тыя, хто вярнуўся, — узбагаціліся карысным вопытам. «На жаль, сярод тых, хто з'язджае, ёсць вельмі класныя спецыялісты, — пагадзіўся з праблемай Прэзідэнт. — Вось гэта небяспечна». Таму вельмі важна зрабіць усё, каб такія дактары вярталіся.

На думку кіраўніка дзяржавы, вопыт універсітэцкай клінікі ў Гродне дазволіць айчыннай медыцынскай адукацыі не толькі пашырыць магчымасці навучальнага працэсу, але і аб'яднаць матэрыяльныя, кадравыя і навуковыя рэсурсы. «Гэта правільны шлях да павышэння выніковасці і якасці меддапамогі жыхарам усёй краіны», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

## Якар для спецыяліста

Інтэлектуальны патэнцыял любой дзяржавы — адораныя студэнты, акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. У краіне сфарміравана сістэма падтрымкі такіх маладых людзей. Развіваюцца навуковыя школы пры медыцынскіх ВНУ. Моладзь удзельнічае ў інавацыйных

Фота БелТА.

айчынных і міжнародных праектах, вынікі якіх паспяхова выкарыстоўваюцца ў нашай краіне і за мяжой. СМІ і спецыялізаваныя выданні папулярызуюць усе дасягненні, адкрываюць новыя імёны.

Беларуская дзяржава можа пахваліцца тым, што нашы выпускнікі забяспечваюцца першым рабочым месцам. І медыцынскія ўніверсітэты — лідары па размеркаванні выпускнікоў, у тым ліку і платнай формы навучання. У сістэмнай рабоце з выпускнікамі медыцынскіх універсітэтаў удзельнічаюць прадстаўнікі органаў мясцовай улады і патэнцыйныя наймальнікі.

У краіне наладжаны маніторынг працаўладкавання маладых урачоў. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, не рэдкасць, калі нават замежнікі жадаюць застацца і лячыць людзей у нашай краіне. «Вядома, найбольш прывабныя месцы ў сталіцы і абласных гарадах. Але і ў рэгіёнах неабходна ўсяляк падтрымліваць маладых спецыялістаў. Кожны чацвёрты з іх (24,5 працэнта) сёння мае патрэбу ў жыллі», — канстатаваў лідар Беларусі.

Прэзідэнт даручыў Міністэрству аховы здароўя і мясцовым органам улады звярнуць асаблівую ўвагу на мадэрнізацыю існуючых інтэрнатаў, у тым ліку сямейнага тыпу, будаваць новае сучаснае жыллё. «Недапушчальна сяліць маладых спецыялістаў у старыя дамы і кватэры», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт праінфармаваў пра прынятае ўжо ў сценах БДМУ рашэнне распрацаваць ва ўрадзе праграму будаўніцтва сямейных інтэрнатаў па тыпе тых, якія пабудаваны для ўрачоў у Бараўлянах.

«Паслухайце, я, калі зайшоў у гэты дом, успомніў час, калі сам закончыў універсітэт і жыў на дзевяці квадратных метрах. Дарэчы, у мяне ўжо было двое дзяцей... Дзевяць квадратных метраў! Лядоўня, тут жа ложак стаяў, канапа і тэлевізар на падаконніку, — успомніў Аляксандр Лукашэнка. — Але калі я зайшоў у гэты дом (у Бараўлянах. — **«Зв.»**), я адразу сказаў міністру і кіраўнікам абласцей, якія былі: «Слухайце, гэта «палац» для маладога чалавека, які можа там жыць да 35-40 гадоў, гадаваць дзяцей. За гэты час вызначыцца і, магчыма, назапасіць сродкі на новую кватэру. Але гэта цудоўны дом. І цана — мізэр. Пастаўлена задача — цягам трох гадоў выпрацаваць праграму і будаваць такія дамы для настаўнікаў, урачоў, работнікаў сацыяльнай сферы і культуры там, дзе гэта больш за ўсё неабходна».

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што гэта ўтрымае моладзь у краіне.

Каб малады ўрач застаўся на рабочым месцы і пасля адпрацоўкі размеркавання, важна таксама паляпшаць інфраструктуру раёнаў, дадаў Прэзідэнт: «Невыпадкова ў Год малой радзімы мною пастаўлена канкрэтная задача развіваць невялікія гарады і пасёлкі па ўсіх сацыяльна-эканамічных кірунках для дасягнення высокага ўзроўню жыцця іх насельніцтва».

## Добры ўрач павінен мець вучняў

Па словах Прэзідэнта, практычная ахова здароўя Беларусі ў адрозненне ад іншых краін СНД выйграла ў якасці падрыхтоўкі ўрача за кошт захавання субардынатуры і інтэрнатуры для студэнта-старшакурсніка.

«Гэта неабходны, як сцвярджаюць спецыялісты, пераходны масток адаптацыі, назапашвання вопыту для будучай самастойнай дзейнасці, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Ліквідацыя інтэрнатуры ў Расіі і Казахстане стварыла пэўныя праблемы ў сістэме бесперапыннай медыцынскай адукацыі ў частцы прымянення атрыманых ва ўніверсітэце ведаў на практыцы. Мы такім шляхам не ідзём».

Больш за тое, Аляксандр Лукашэнка згодны з меркаваннем аб неабходнасці ўзмацніць адказнасць кожнага кіраўніка за падрыхтоўку маладога ўрача-інтэрна да самастойнай работы.

«Пакуль інтэрнатура існуе, адказваць мусіць той, хто вядзе гэтага маладога чалавека, а не толькі ён сам за сябе. Тут вельмі важна настаўніцтва, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Вопытны ўрач мусіць умець разгледзець і падтрымаць таленты, падзяліцца сваімі ведамі, вырасціць годную змену».

Пры гэтым у Прэзідэнта ёсць інфармацыя, што ў сферы аховы здароўя з'явілася нейкая «сямейнасць». «Мама-тата ўрачы, дзіця ўрач і гэтак далей. Гэта добра. Але дрэнна, калі некалькі сем'яў — клан, туды вельмі складана трапіць іншым. Я ўжо некалькі гадоў вельмі паспяхова разрубаю гэту «клановасць». І я працягну гэтую работу: ніякіх кланаў быць не павінна. Яны імкнуцца перадаць родным, блізкім, знаёмым гэты веды — а чаму не ўсім?» — гэтая тэндэнцыя насцярожвае Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка таксама запатрабаваў максімальнага выкарыстання патэнцыялу адукацыйных цэнтраў РНПЦ для падрыхтоўкі ўрачоў да выканання высокатэхналагічных умяшанняў.

Яшчэ адно патрабаванне кіраўніка дзяржавы — абсталяваць рабочае месца ўрача самым сучасным начыннем, даць кожнаму спецыялісту не толькі ў буйных гарадах, але і ў рэгіёнах магчымасць прафесійнага росту. Мэта ясная — каб у любым населеным пункце чалавек мог атрымаць максімальна якасную медыцынскую дапамогу. Асабліва першасную.

У свой час Прэзідэнт даручаў ствараць рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры.

«І мы ад гэтага маем добры эфект. Яны ўсім неабходным абсталяваныя, там працуюць высакакласныя спецыялісты, і там ужо вучым урачоў вузкім спецыяльнасцям. Мэта — высокатэхналагічныя аперацыі «зверху» апускаць «уніз». Калі ў РНПЦ навучыліся рабіць складаныя аперацыі, пераносім іх на абласны ўзровень», — растлумачыў ідэю Аляксандр Лукашэнка.

Такім чынам, у Беларусі ажыццяўляецца дыферэнцыраваны падыход да пашырэння пераліку медыцынскіх паслуг у горадзе і ў вёсцы.

## Будучыня — за «сямейнымі ўрачамі»

Сёння ў амбулаторна-паліклінічных арганізацыях Беларусі працуе больш за тры з паловай тысячы ўрачоў агульнай практыкі — тэрапеўтаў, якія прайшлі паглыбленае навучанне. Але Аляксандра Лукашэнку турбуе насцярожанае стаўленне насельніцтва да кампетэнцыі гэтых спецыялістаў. Часткова недавер тлумачыцца звычкай грамадзян, што ў кожнай вёсцы павінны быць медыкі ўсіх вузкіх спецыяльнасцяў. Зрабіць гэта можна было б, але тады давядзецца ў кожнай вёсцы пабудаваць шпіталь, падрыхтаваць спецыялістаў з добрай зарплатай, даць ім жыллё... Між тым розныя краіны выбралі шлях «сямейнага доктара». І маладое пакаленне беларусаў таксама, на думку Прэзідэнта, выбірае такі шлях.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Еўропе і ЗША менавіта з урачамі агульнай практыкі, або так званымі «сямейнымі дактарамі, насельніцтва ўзаемадзейнічае часцей за ўсё, прычым з пакалення ў пакаленне. Неабходна павышаць прэстыж урача агульнай практыкі і ў нас, перакананы Аляксандр Лукашэнка, навучыць яго ўсім метадам аказання спецыялізаванай дапамогі пры простай паталогіі. Любы пацыент будзе задаволены, калі яго ўрач зможа сам выканаць неабходнае дыягнастычнае даследаванне і своечасова прызначыць правільнае лячэнне. За такімі медыкамі — будучыня.

## Бярыце прыклад з доктара

Яшчэ адно пытанне, якое часта ўзнікае ў медыцынскіх колах: ці будзем мы ўводзіць сусветную практыку ліцэнзавання кожнага ўрача або ўкараняць вопыт Расіі па абавязковай акрэдытацыі?

«Сёння ўвядзенне ў краіне такіх формаў ацэнкі ўзроўню кампетэнтнасці лекараў заўчаснае. Расійскі вопыт акрэдытацыі медработнікаў пакуль не даказаў сваёй эфектыўнасці. А вось перагледзець дзейную сістэму павышэння кваліфікацыі ўрачоў і прыняць меры па яе ўдасканаленні неабходна. Міністр атрымаў такую задачу, гэтым займаецца Міністэрства аховы здароўя. Таксама варта матываваць лекараў на павышэнне кваліфікацыйнай катэгорыі», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на прафесійны імідж урача і ўзровень яго ўласнага фізічнага здароўя. «Медыцынскі работнік, які ўвасабляе сваім вонкавым выглядам вядомую прымаўку «шавец без ботаў», робіць толькі дрэннае ўражанне. Колькі ў мяне ні было ўрачоў, яны ніколі не былі тоўстыя. Урач павінен служыць прыкладам

# МОЖА ЎСЁ

для пацыентаў. Здаровы спосаб жыцця павінен лічыцца базавай прафесійнай якасцю для будучага медыка. Вось я бачу вас усіх, і нават дзіўна — у ідэальнай форме. Вось такія і заставайцеся, пастаўце перад сабой такую задачу», — папрасіў Аляксандр Лукашэнка.

Для гэтага, упэўнены ён, шмат не трэба. Тады і людзям будзе прасцей растлумачыць, што фізічнае здароўе трэба берагчы заўжды.

«Правільна харчавацца, не піць і не курыць... Неразумны той, хто курыць. Ладна, выпіў там — славяне навучылі нармальна піць, — пажартаваў Прэзідэнт. — Але не празмерна». Курэнне ж Аляксандр Лукашэнка назваў «катастрофай». «Марнаваць велізарныя грошы, сядзець і смактаць гэту папяроску, а некаторыя два пачкі на дзень выкурваюць... Не рабіце гэтага! Калі нехта пачаў, кіньце зараз, потым будзе складана», — параіў ён моладзі.

Таксама кіраўнік дзяржавы даручыў студэнтам займацца фізкультурай, і самае галоўнае — своечасова праходзіць абследаванні.

Зусім хутка студэнты, якія сустрэліся з Прэзідэнтам, атрымаюць дыпломы, дадуць клятву беларускага ўрача і прыступяць да сваіх непасрэдных абавязкаў. «Я вельмі хачу, каб ваш медыцынскі шлях быў годны і паспяховы, каб на ўсім яго працягу не было страчана самае галоўнае — прафесійны інтарэс. Вы тыя, каму даверaны самы каштоўны рэсурс краіны — здароўе нашага народа. А выкладчыкам хачу пажадаць, каб да вас з году ў год прыходзілі добрыя студэнты. Разумныя, чыстыя сэрцам, якія жадаюць змяніць гэты свет і выратаваць кожнае чалавечае жыццё», — завяршыў сваю прамову кіраўнік дзяржавы.

* * *

Пасля выступлення Аляксандр Лукашэнка запрасіў аўдыторыю задаць яму пытанні. Адно з першых датычылася экалагічнай бяспекі для Беларусі.

## «Маё крэда — прырода»

Прэзідэнт адказаў, што самая вялікая вартасць нашай краіны — прыроднае багацце і прыгажосць. «Мы не без недахопаў, я гэта не горш за іншых бачу і вельмі шчыльна гэтым займаюся», — дадаў ён і растлумачыў, наколькі гэтая праблема важная для яго асабіста.

«Калі мяне называюць прасунутым аграрыем, я часта нават сваім калегам-прэзідэнтам кажу: кіньце, які я спецыяліст! Так, я вясковы мужык, усё рабіў сам, бацькі не было, таму даводзілася працаваць, — падзяліўся думкамі кіраўнік дзяржавы. — Вучыўся, кіраваў прадпрыемствам (не толькі ў сельскай гаспадарцы), але калі вы хочаце ведаць маё крэда, то яно — прырода. Чысціня прыроды, дрэвы, якія я прымушаю, пачынаючы ад членаў урада і заканчваючы студэнтамі і школьнікамі, высаджваць, як мы гэта некалі рабілі. Мы павінны гэта рабіць сваімі рукамі, тым больш мы можам».

Аляксандр Лукашэнка ўспомніў свае параўнальна нядаўнія ўражанні ад паездкі па Гродне, дзе старыя дамы патанаюць у зеляніне, а на новыя мікрараёны сорамна глядзець: «Клетак гэтых панаставілі, і нідзе няма ніводнага дрэва». Па яго даручэнні дрэвы там былі высаджаны ўжо ўвосень.

«Я чалавек, крэда якога — прырода, — паўтарыў Прэзідэнт. — Таму і асабіста, і каб захаваць гэту чысціню Сінявокай, нам трэба займацца аховай навакольнага свету, перш за ўсё — прыроды».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што пры ім створана Інспекцыя па ахове жывёльнага і раслінnага свету, якая паспяхова змагаецца з браканьерствам у лясах, на рэках і азёрах, ён асабіста кантралюе адвод зямель сельскагаспадарчага прызначэння для будаўніцтва. «Мы павінны зберагчы тое, што нам дасталася ад нашых продкаў... Гэта мае сапраўдныя адносіны. І ў гэтым кірунку мы будзем вельмі сур'ёзна працаваць», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка моладзі.

## Прэзідэнт даручыў разгледзець пытанне памілавання па артыкуле 328

Аб гэтым ён паведаміў, адказваючы на пытанне пра барацьбу з проціпраўным кантэнтам у інтэрнэце, асабліва па продажы наркатычных рэчываў. На думку Прэзідэнта, выяўленне і блакіроўка такога кантэнту праводзіцца недастаткова эфектыўна.

«Не таму, што мы не ўмеем гэтага рабіць. Мы прынялі вельмі жорсткія меры па барацьбе з наркотыкамі. Я разумею, што адна справа вырабляць наркотыкі, другая — іх распаўсюджваць, а трэцяя — ужываць. Напэўна, мы недаацанілі, што ўжыванне наркотыкаў — гэта шмат у чым хвароба, горшая, чым піць-курыць», — падзяліўся думкамі Аляксандр Лукашэнка.

Ён перакананы, што хлопцы і дзяўчаты трапляюць у залежнасць перш за ўсё праз патуранне бацькоў. «Персанальна кожнага чалавека разгледзім, і там, дзе можна, — на парукі бацькам. І крый божа, зноў трапяць — разам з бацькамі пойдуць у тую калонію. Гэта бяда. Але пасля прыняцця адпаведных жорсткіх мер у нас колькасць гэтых злачынстваў значна скарацілася», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуў увагу, што ў транзітнай краіне, дзе сінтэтычныя рэчывы трапляюць часцей за ўсё праз Заходнюю Еўропу, а біялагічныя наркотыкі — праз Расію з Цэнтральнай Азіі, асабліва цяжка. А спробы кантраляваць інтэрнэт выклікаюць абвінавачванні ў «дыктатуры».

«У мяне адна прэтэнзія да інтэрнэту: калі ты там вылаяўся, падпішыся. З сеціва трэба прыбраць тое, што садзейнічае наркаманіі, тэрарызму і падобным рэчам. Магчыма, нам і давядзецца калісьці прымаць такое рашэнне, але, хутчэй за ўсё, пасля прэзідэнцкіх выбараў, каб нас не абвінавацілі ў адсутнасці магчымасці самавыяўлення», — паведаміў кіраўнік дзяржавы.

Ён аддаў належнае спецыялістам, якія навучыліся абараняць інтэрнэт-прастору, але адзначыў: пакуль што ў гэтай сферы ёсць над чым працаваць.

## Мы здольныя на цуд

Студэнт з Ізраіля, які атрымлівае ў Беларусі другую вышэйшую адукацыю, спытаў Прэзідэнта, ці можна падоўжыць тэрмін, на працягу якога замежныя грамадзяне, што прыязджаюць у Беларусь працаваць або навучацца, павінны зарэгістравацца па месцы пражывання. Цяпер гэта неабходна зрабіць цягам пяці дзён. «Гэтага часу дастаткова, але складана, калі ўлічыць, што мы павінны прайсці медыцынскі агляд, афармiць некаторыя дакументы, засяліцца ў інтэрнат або ў здымную кватэру», — аргументаваў суразмоўнік.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што рашэнне падоўжыць гэты тэрмін да 10 дзён будзе падпісана ім ужо ў найбліжэйшы панядзелак.

Карыстаючыся нагодай, Прэзідэнт расказаў, як у Беларусі лячыўся былы кіраўнік палітычнай разведкі Ізраіля «Масад».

«Я неяк з ім сустракаўся даўно, ён прыязджаў да нас, у нас былі добрыя адносіны, хоць мы працавалі ў розных плоскасцях. І гэты чалавек захварэў. Яму было за 70 гадоў. Яму патрэбна была перасадка органа. Ён паехаў у Злучаныя Штаты Амерыкі. Там адмовілі з-за ўзросту. Увесь Захад адмахнуўся. Ён да мяне. Звоніць міністр: што будзем рабіць? Хвароба цяжкая, зацягнулі, усё можа быць, але ўсе адмовіліся. І мы яго паспяхова прааперыравалі. Вось вам — наша медыцына, нашы маладыя хлопцы, якія здзейснілі подзвіг, падарыўшы чалавеку гады жыцця», — з гонарам сказаў Прэзідэнт.

Наша ахова здароўя можа рабіць усё, рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. «Трэба толькі даць урачам самае высокатэхналагічнае абсталяванне. І мы ўзялі курс на тое, каб узброіць нашых урачоў усім неабходным. І яны будуць рабіць цуды. І гэта перш за ўсё. А потым — жыллё, заробкі і іншае».

Фота БелТА.

## Страхавая медыцына будзе. Але не адразу

Адно з пытанняў з боку студэнтаў датычылася магчымасці ўвядзення ў Беларусі сістэмы абавязковага медыцынскага страхавання.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што ён прыхільнік развіцця страхавой медыцыны. «Але адразу нельга, трэба, каб людзі былі да гэтага падрыхтаваныя, — растлумачыў ён. — Ведаю, медыкі лічаць, што яно (страхаванне. — **«Зв.»**) павінна быць абавязковае і як мага хутчэй. Маўляў, яны (урачы) стануць багатыя праз гэта. Але ці ў стане нашы людзі будуць за гэта заплаціць?»

Найперш трэба павялічыць даходы і заробкі людзей удвая, дадаў Прэзідэнт. «Ці дазволіць гэта зрабіць эканоміка? — задаў ён рытарычнае пытанне. — Так, добра — страхавая медыцына: скінуў на людзей і бывай здаровы. Але трэба разумець, што будзе потым. Мы наступствы пралічвалі і на гэтым этапе дамовіліся: вось бясплатная, вось платная, а вось — страхавая медыцына».

Цяпер у краіне існуе добраахвотнае медыцынскае страхаванне. Абавязковае страхаванне — у перспектыве.

## Памяць не менш важная за здароўе

Гомельскія студэнты нагадалі, што на Гомельшчыне калісьці існавала вёска Ала, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны было знішчана 1758 чалавек. Цяпер там пустка, але ўжо налета пачнецца будаўніцтва мемарыяльнага комплексу. Студэнтка ГДМУ запрасіла Прэзідэнта на адкрыццё мемарыяла. Аляксандр Лукашэнка ініцыятыву падтрымаў і паабяцаў прыехаць.

Ён таксама даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта вывучыць праект і, калі трэба, удасканаліць. Аказалася, што кіраўнік дзяржавы добра ведае гэтую гісторыю.

«Няправільна, што мы не добраўпарадкоўваем такія месцы, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Добра, што вы вырашылі ўвекавечыць. Будзем усе ўдзельнічаць, і, можа, усе сродкі, зароблeныя Гомельскай вобласцю на суботніку, пакінем там», — паабяцаў ён.

На думку Прэзідэнта, тое, што студэнты ўзнімаюць такія пытанні, значыць, што ў моладзі і краіны ў цэлым ёсць будучыня.

## Рэцэпт паспяховасці

Задавалі студэнты і пытанні, якія натхнілі Прэзідэнта на філасофскія разважанні: чаму б ён хацеў навучыцца, напрыклад.

«Мне здавалася, што я ўжо нечаму навучыўся... Калі сказаць «усяму» — гэта будзе няправільна. Я ўсё ж такі з першай адукацыі гісторык, і філасофіі тады вучылі добра. Таму, калі зыходзіць з філасофскага разумення жыцця і ўсіх працэсаў, чалавек не можа ўмець усё. Значыць, нечаму яму яшчэ трэба вучыцца», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

Калі ўжо зайшла шчырая размова, ён прызнаўся, што мусіць паглыбляцца па кірунках, дзе нешта ўмее, бо Прэзідэнт мусіць валодаць усімі пытаннямі ўвогуле.

«Англійскую, напэўна, ужо вывучаць не стану, галава забіта, не ўлезе туды нічога... Вярнуцца да музыкі сваёй — думаю, хай сын малодшы гэтым займаецца. Я забыў, як гэта. Таму гэта вельмі важна для вас зараз — калі вы нешта ўмееце, не кідайце. Вярнуцца потым будзе вельмі складана. Вас захлісне жыццёвая мітусня», — прызнаўся кіраўнік дзяржавы.

Ён упэўнены, што студэнцтва — час, калі ствараецца база на ўсё далейшае жыццё. Таму, дарэчы, Прэзідэнт і патрабуе прыбраць усё, што студэнты вывучаюць «дзеля заліку». Каб не было як у сельскагаспадарчых ВНУ, калі студэнты толькі на трэцім курсе «нюхнулі дабра» і пачалі кідаць вучобу. А на іх навучанне дзяржава ўжо патрацілася.

## Цярпенне, прафесіяналізм і трошкі любові

Студэнтка з Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта спытала кіраўніка дзяржавы: якімі якасцямі, на яго погляд, павінен валодаць студэнт-медык, каб адбыцца як прафесіянал сваёй справы?

«Адна толькі павінна быць якасць — цярпенне, — адказаў Прэзідэнт. — І прафесіяналізм. Ваша прафесія асаблівая: як недахопы, так і станоўчае людзі заўважаюць імгненна. Добрых спецыялістаў ведае ўся краіна і ўвесь свет».

Аляксандр Лукашэнка прывёў у праклад трансплантолага, сенатара і кіраўніка РНПЦ Алега Румо і паведаміў, што паабяцаў яму пашырыць РНПЦ «Транспланталогія органаў і тканак».

«Калі нехта з вас будзе так прасоўваць вашу спецыяльнасць, калі з'явяцца жадаючыя і новая школа, а гэта — моладзь, тады яны (трансплантолагі. — **«Зв.»**) былі маладымі, я заўсёды буду прыхільнікам, каб будаваць, развіваць, пашыраць, закупляць абсталяванне... Усё залежыць ад вас. Таму — цярпенне і прафесіяналізм, — падсумаваў Прэзідэнт. — Калі гэта будзе, вы адбудзецеся як урачы. Ну і, як я казаў раней, трошкі любові да радзімы потым дадайце».

## На Новы год Прэзідэнт будзе працаваць

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся студэнтам, што для яго ўсе святы, хоць і чаканыя, — вялікая нагрузка.

«Грамадзяне выпіюць шампанскага і закусяць аліўе. А краіна жыве. Цвярозыя хто? Пагранічнікі, лётчыкі, ПВАшнікі, медыкі працуюць. І вельмі часта бывае, што людзі ў святы бесклапотныя, думаюць, што ўся планета вакол іх круціцца, забываюцца на бяспеку. Таму часта ў гэтыя святочныя дні шмат праблем, якія вырашыць толькі Прэзідэнт», — растлумачыў ён.

Акрамя насычанага міжнароднага парадку дня, які пачынаецца 20 снежня, кіраўнік краіны праанансаваў сёлета правядзенне Венскага балю ў Палацы Незалежнасці, Прэзідэнцкай ёлкі, удзел у акцыі «Нашы дзеці».

Аляксандр Лукашэнка расказаў студэнтам, што больш за ўсё цэніць падарункі, якія чалавек зрабіў уласнымі рукамі.

Будучыя медыкі падрыхтавалі Прэзідэнту менавіта такі — аўтарскі твор студэнткі 6 курса педыятрычнага факультэта БДМА Юліі Галубчык. На карціне дзяўчыны адлюстравана навакольная мясцовасць аграгарадка Александрыя Шклоўскага раёна: прырода на берагах Дняпра з зонамі адпачынку. Аўтар таксама атрымала падарунак ад Прэзідэнта — яго ручку.

Рэктар універсітэта запрасіў кіраўніка дзяржавы на святкаванне стогадовага юбілею навучальнай установы ў 2021 годзе. Аляксандр Лукашэнка паабяцаў, што незалежна ад свайго статусу праз два гады абавязкова наведае ўрачыстасць.

* * *

Час сустрэчы быў абмежаваны выключна жаданнем аўдыторыі. Такі падыход акрэсліў сам Прэзідэнт: ніхто не павінен пайсці, не атрымаўшы адказу на пытанне. Таму размова цягнулася больш за дзве гадзіны. Напрыканцы размовы кіраўнік дзяржавы запрасіў будучых медыкаў, у тым ліку з абласных цэнтраў, на экскурсію ў рабочую рэзідэнцыю Прэзідэнта. Ён нездарма загадаў адкрыць Палац Незалежнасці для народа, каб беларусы і госці краіны маглі ўбачыць, на што здатныя нашы будаўнікі, дызайнеры і мастакі.

Завяршылася сустрэча апладысментамі, якімі, напэўна, ва ўніверсітэце не дзякавалі яшчэ ніводнаму лектару.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Варвара МАРОЗАВА.**

Сацыяльны праект «Дажынкі»

# ПАСЛЯ БАЛЮ

## Што застаецца людзям, калі фестываль становіцца гісторыяй?

**У верасні Ружаны адгулялі абласныя дажынкі. Пра адрас дыслакацыі фестывалю працаўнікоў вёскі стала вядома за год да падзеі, калі адзначалі аналагічнае свята ў Высокім. Тады і пачалася падрыхтоўка пасёлка, славутага велічным сапегаўскім палацам. Прымаліся адпаведныя рашэнні аб выдзяленні сродкаў на добраўпарадкаванне, пачыналася іх паступовае асваенне. Усяго падчас падрыхтоўкі было патрачана 4 мільёны 554 тысячы рублёў бюджэтных сродкаў. Несумненна, многае ўдалося зрабіць.**

Віктар ДАРАНЕВІЧ, Андрэй ЗЫБКО, Аксана ЮРКОЎСКАЯ каля будынка харчовага блока бальніцы.

### Падкрэслілі адметнасць, ушанавалі гісторыю

Са **старшынёй Ружанскага сельскага Савета дэпутатаў Аксанай ЮРКОЎСКАЙ** праходзім па вуліцах памаладзелага пасёлка. І хоць на двары снежаньская слата, Ружаны выглядаюць прыбрана, нават крышачку святочна. Асабліва цікавай здаецца цэнтральная вуліца Савецкая, дзе паток машын можна параўнаць з сярэднім горадам. Транспарт транзітны, бо Ружаны стаяць на скрыжаванні ўсіх дарог. Тут перасякаюцца маршруты, якія злучаюць Украіну з Прыбалтыкай, Белавежскую пушчу з Мінскам, Гродзеншчыну з Палессем. І ружанцы, вядома, ганарацца, што праязджыя людзі бачаць іх пасёлак такім. Тут не проста паправілі асфальт, праклалі дарожкі, зрабілі капітальны рамонт асобных дамоў, у іншых пабудоў пафарбавалі фасады — месцічы знайшлі свае цікавінкі, падкрэслілі адметнасць, ушанавалі гісторыю.

Цяпер, ідучы на пошту, міжволі паднімеш галаву, каб паглядзець на Ружаны XIX стагоддзя, панарама якіх перанесена са старой паштоўкі на сцяну вузла сувязі. На старых цагляных дамах з'явіліся рэпрадукцыі партрэтаў асоб з роду Сапег. А фасад Цэнтра культуры і вольнага часу ўпрыгожвае карціна-выцінанка тутэйшага майстра Юрыя Малышэўскага. Крыху паводдаль ад Цэнтра — невялічкая плошча з wi-fi-лаўкай, упрыгожанай недвухсэнсоўным сэрцам: вядомая рэч, цяперашнім закаханым без інтэрнэту ніяк, а тут ён бясплатны — атрымалася ідэальнае месца для спатканняў. Цёплай парой гэтая лаўка не пустуе, хіба цяпер, у снежні, ахвотных пасядзець менш.

### Сквер Якуба Коласа

Сквер гэты — прадмет асаблівага гонару мясцовай улады. Ён літаральна вымаляваўся на вачах у жыхароў падчас падрыхтоўкі да дажынак. На гэтым месцы фактычна была пустка вакол заросшага вадаёма. Найперш акультурылі возера, праклалі пешаходныя і веладарожкі, паставілі лаўкі, пасадзілі дрэвы. Ну а потым атрымалі прэмію за добраўпарадкаванне і купілі трэнажоры. Цяпер яны даступныя для кожнага, хто хоча палепшыць сваю фізічную форму. Тут ёсць і дзіцячая пляцоўка — мамы з каляскамі ў цёплую пару часта адпачываюць. Такім чынам, аформілася цудоўнае месца для адпачынку ўсёй сям'ёй.

Па-сучаснаму стала выглядаць і вуліца, якая дала назву скверу: дарожная разметка, пешаходныя пераходы, тратуар, агароджа — усё нагадвае пра нядаўнія рамонт і абнаўленне.

### Капітальны рамонт

Асобна трэба сказаць пра двухпавярховыя дамы па вуліцы Савецкай, якія перажылі капітальны рамонт. Пабудаваныя яшчэ ў 50-х гадах, яны, несумненна, патрабавалі ўвагі. Праўда, у канцы 90-х тут ужо быў капрамонт, у выніку яго ў кватэры падвялі каналізацыю. Пра гэта расказалі жыхары дома — былыя настаўнікі Сяргей Уладзіміравіч і Соф'я Мікалаеўна Свяцкія. Галава сям'і вельмі задаволены праведзеным рамонтам: «У доме памянялі дах, часткова заменены трубы ў кватэрах. Усе работы праведзены ў сціслыя тэрміны, ніякіх прэтэнзій». Соф'я Мікалаеўна заўважыла, што спярша вельмі нязвыклы быў шэры колер сцен. «Але моладзь гаворыць, што гэта стылёва, модна. Ну і я прыгледзелася, а лепш сказаць, прывыкла. Галоўнае, у двары парадак, навокал чыста, як і ва ўсім пасёлку». Суседка іх Галіна Фёдараўна Віркоўская сказала, што спачатку рамонтнікі нарабілі ёй клопату: пабелка абсыпалася са столі, тынкоўка пайшла трэшчынамі. Але ж пазней яны ўсё паправілі, і гаспадыня пагадзілася, што стала лепш, чым было.

На кожнай вуліцы, у кожным завулку знойдзецца нешта новае, што пабудавана альбо зроблена падчас падрыхтоўкі да абласнога фестывалю. Вуліца Урбановіча, якая выходзіць да знакамітага палаца Сапег, таксама пахарашэла. На фасадах будынкаў з'явіліся рэпрадукцыі карцін, выцінанак, гравюр. На гэтай жа вуліцы знаходзіцца ружанская гарадская бальніца, якая шмат у чым змянілася і стала аб'ектам аховы здароўя новага ўзроўню.

### Харчовы блок і абсталяванне

Нават па адной гэтай бальніцы дажынкі можна смела называць удалым сацыяльным праектам. **Загадчык медыцынскай установы Андрэй ЗЫБКО** расказаў, што стацыянар складаецца з трыццаці тэрапеўтычных і пяці педыятрычных ложкаў. Яшчэ дзесяць месцаў адведзена пад бальніцу сястрынскага догляду. Ёсць і паліклініка з дзённым стацыянарам. Летась і сёлета тэрыторыя бальніцы была ўладкавана, праведзены рамонт двара і фасада будынка. З'явілася паркоўка для транспарту, якой раней не было наогул. І галоўнае, з былога падсобнага памяшкання атрымаўся сучасны харчовы блок. Будынак для прыгатавання ежы яшчэ не здадзены ў строй, але тут ужо рыхтуюцца да наваселля. Паглядзець на прыгатаванні і ацаніць гатоўнасць прыехаў **галоўны ўрач Пружанскай цэнтральнай раённай бальніцы Віктар ДАРАНЕВІЧ.** Віктар Міхайлавіч расказаў, што ружанская бальніца нядаўна атрымала холтараўскія маніторы для ЭКГ. Метад паспяхова асвоены ружанскімі ўрачамі, ужо праведзена каля 40 даследаванняў. Таксама паступіла сучаснае абсталяванне для правядзення аналізаў. Ну а харчовы блок спраектаваны і аснашчаны так, што далёка не кожная бальніца раённага альбо абласнога цэнтра можа пахваліцца падобным.

Не так даўно тут лячылася масквічка. Жанчына адпачывала ў санаторыі «Ружанскі», захварэла на пнеўманію і прайшла курс лячэння ў стацыянары. «Дык яна пакінула добры водгук пра бальніцу, — кажа **старшыня сельскага Савета Аксана ЮРКОЎСКАЯ.** — А жыхары, асабліва пенсіянеры, гавораць, што нашу лякарню трэба пашыраць, усё для гэтага ёсць. Ды апошняе залежыць ад колькасці насельніцтва ў пасёлку і навакольных вёсак. Вырасце насельніцтва — адкрыюцца дадатковыя ложкі. Ёсць стандарты, ад якіх мы не можам адысці».

І не толькі ўстанова аховы здароўя рэканструявана дзякуючы гэтым дажынкам. Рамонт праведзены ў школе, дзіцячым садку, іншых аб'ектах сацыяльнага прызначэння.

### Чырвоны глог

Ружаны здаўна вядомыя не толькі велічным палацам, але і сваім чырвоным глогам. Калі ён зацвітаў у канцы мая пяшчотна-ружовым колерам, Ружаны выглядалі па-вясновому маладымі, а пасля цвіцення ягады наліваліся чырванню, і пасёлак набываў нейкую ўрачыстасць. Вядома, глог не сам тут вырас. Яго разводзіў жыхар пасёлка, альтруіст, энтузіяст, заслужаны настаўнік рэспублікі Уладзімір Рэкуць. Нястомны аматар прыгажосці купляў за свае грошы саджанцы ў розных канцах краіны і ўпрыгожваў малую радзіму. Было гэта недзе ў 60—70-х гадах. Вядома, расліны да гэтай пары састарэлі, некаторыя ссохлі, іншыя былі выкарчаваны падчас добраўпарадкавання. І тады людзі схамяніліся, нібы ўспомнілі. Сталі звяртацца ў сельскі Савет. Дэпутаты параіліся і вясной купілі першыя 20 кустоў глогу. Тады Аксана Юркоўская прынесла таблічку з тэкстам і прымацавала да пасадкі — напісала, што глог пасаджаны ў гонар шаноўнага ружанца, заслужанага настаўніка і ў памяць пра яго. Старшыня сельсавета заклікала беражліва ставіцца да саджанцаў. «І ведаеце, ніводнага куста не зачапілі, — кажа Аксана Уладзіміраўна. — Хоць з кветкамі на клумбах здараўся грэх — у сэнсе не кожны спраўляўся са спакусай узяць кветачку і пасадзіць у свой агародчык. А тут — ніхто. Бо памятаюць і паважаюць настаўніка». А навесну пасадзяць яшчэ 31 куст глогу.

Цэнтр культуры з выцінанкай.

### Больш святла

— Складаны перыяд быў для нас — падрыхтоўка да фестывалю. Пастараліся зрабіць як мага больш, разумелі, што такая магчымасць добраўпарадкаваць населены пункт будзе не скора, — разважае кіраўнік мясцовай улады. — Кожны тыдзень, а то і часцей прыязджаў старшыня райвыканкама (Юрый Бісун. — **Аўт.**), прасіў усе службы выкладвацца па максімуме, казаў: «Для людзей робім». Праўда, і самі людзі многае зрабілі, шмат агароджы абноўлена, пафарбавана, на падворках парадак наведзены, на суботнікі выходзілі, не лічыліся з часам, не засталіся ўбаку ад добрай справы прадпрымальнікі.

Калі ж звярнуцца да лічбаў, то атрымліваецца, што заасфальтавана 14 вуліц і чатыры завулкі агульнай працягласцю 7,5 кіламетра, адрамантавана 1200 квадратных метраў тратуараў і пракладзена 3360 квадратных метраў новых. Заменены асобныя ўчасткі водаправода і вулічнай каналізацыі, ліній электраперадачы, месцамі ўстаноўлена новая жалезабетонная агароджа. Уведзена ў строй артэзіянская свідравіна.

— Можна і яшчэ пералічваць. Відавочна, што ўсё гэта паўплывае на паляпшэнне якасці жыцця, — падсумоўвае старшыня.

А сквер драўляных скульптур, які з'явіўся насупраць аўтавакзала, ажывіў гэтыя мясціны. У Ружанах наогул драўляных скульптур многа. Пасёлак не раз выбіралі месцам плэнэраў рэзчыкі па дрэве, работы часта пакідалі. Цяпер яны ўпрыгожваюць вуліцы.

Засталося спытаць ружанцаў, як яны самі ацэньваюць зробленае. Прадпрымальнікі Наталля і Валерый Ланшаковы сказалі, што стала прыгажэй і ўтульней: «Мы і сына малодшага агітуем, каб пераязджаў з Мінска». А жанчыны на вуліцы Урбановіча падкрэслілі: «Ліхтары дадатковыя павесілі, святла стала больш». І ўсе ў адзін голас кажуць, што трэба павялічваць колькасць рабочых месцаў, развіваць вытворчасць, каб моладзь заставалася, каб Ружаны прырасталі насельніцтвам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Пружанскі раён.*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Названа самая ўплывовая жанчына года

ж) операции в казино и иных игорных заведениях, оплата ставок и пари, в том числе через Интернет (ПАРИ / трек / казино / ЛОТО) и операции безналичной оплаты в казино;

з) операции, связанные с оплатой налоговых платежей, государственных сервисов, брокерских услуг, операции за телекоммуникационное оборудование, включая продажу телефонов в салонах связи, дорожные чеки;

и) безналичные расходные операции по оплате товаров/работ/услуг в случае возврата товаров/услуг с перечислением денежных средств на Карточку;

г) операции, совершенные до регистрации в Рекламной игре в личном кабинете.

Во избежание сомнений, ни при каких условиях не учитывается при начислении баллов безналичная расходная операция, совершенная с использованием Карточки, но не посредством Apple Pay.

Не учитываются при начислении баллов безналичные расходные операции, которые совершены с использованием Карточки посредством Apple Pay до даты регистрации Участника в Рекламной игре.

Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных Участником операций, в том числе обратиться в Альфа-Банк в целях проверки совершенных в период проведения Рекламной игры операций посредством Apple Pay, в том числе для пересчета общего количества баллов, необоснованно начисленных (не начисленных) баллов по операциям, совершенных Участником в период произошедшего технического сбоя программного обеспечения, обеспечивающего учет и отражение операций.

Организатор вправе отказать (приостановить) в участии в Рекламной игре Участникам, злоупотребляющим ее условиями. Под злоупотреблением условиями Рекламной игры понимается совершение Участником действий, которые, по субъективному мнению Организатора, не имеют разумного смысла, влекут за собой получение Участником необоснованных выгод, основанных преимущественно на технических и/или организационных особенностях и/или условиях проведения Рекламной игры.

**10. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения выигравших участников рекламной игры.**

**10.1.** К розыгрышу данные об Участниках Рекламной игры и общем количестве всех шансов, а также шансов каждого Участника Рекламной игры формируются Организатором в пять списков для розыгрыша, которые включают в себя: порядковый номер Участника Рекламной игры, его Ф.И.О., мобильный телефон, дату и время обмена баллов на шансы, номер шанса. Организатор формирует список для розыгрыша, где присваивает каждому шансу один порядковый номер, начиная с 0000001 и выше.

Для розыгрыша каждого из Призов 1–5 формируется отдельный список по дате и времени обмена баллов на шансы в личном кабинете. При совпадении времени обмена баллов на шансы, список дополнительно сортируется в алфавитном порядке начиная с буквы «А», по фамилии, имени, отчеству участника.

**10.2.** Розыгрыш Призов 1–5 состоится 05.05.2020 года в 11.00 в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Краснозвездная, 18Б, 4-й этаж.

На каждый зарегистрированный порядковый номер шанса Организатор оформляет одну карточку Участника, которая содержит: порядковый номер шанса Участника, фамилию и имя Участника.

Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в таблице № 1 п. 8 Правил.

Все карточки Участников, участвующие в розыгрыше Приза, засыпаются в лототрон и перемешиваются.

Один из членов комиссии достает из лототрона последовательно одну за другой необходимое количество карточек Участника – так определяются победители, т. е. обладатели Приза.

Таким же способом определяется по одному резервному победителю для Приза 1 и Приза 2 (всего три резервных победителя).

Карточки Участников, ставших победителями розыгрыша Приза, извлекаются из лототрона и не принимают участие в последующем розыгрыше.

**11. Место, порядок и сроки выдачи призов и уведомления победителей.**

Победители Рекламной игры уведомляются о выигрыше по почте и по телефону не позднее **10.05.2020 года.**

После получения уведомления о выигрыше, победители Приза 1 должны **не позднее 15.06.2020 года**, победители Приза 2 – **не позднее 20.05.2020 года**, а победители Призов 3–5 – **не позднее 30.06.2020 года,** в любой рабочий день с 9.00 до 18.00 либо в субботу с 10.00 до 13.00 прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Краснозвездная, 18Б, 4-й этаж с предварительным согласованием даты и времени прибытия победителя с представителем Организатора по телефону +375 44 555 11 66.

При получении приза Победитель должен предъявить документ, удостоверяющий личность (действующий паспорт гражданина Республики Беларусь или вид на жительство).

В случае если с Победителем Приза 1 до **15.06.2020 года**, а с Победителем Приза 2 до **20.05.2020 года**, не удается связаться и уведомить о выигрыше, либо Победитель письменно отказался от Приза, либо не предоставил необходимые подтверждающие документы, указанные в настоящих Правилах, то право на получение Приза переходит к резервному победителю Приза 1 и Приза 2, определенного при проведении розыгрыша.

Резервные Победители Приза 1 и Приза 2 извещаются о выигрыше по почте и по телефону в течение 1 (одного) рабочего дня с момента перехода права на получение Приза.

Для получения Приза 1 Резервный Победитель должен не позднее 30.06.2020 года прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Краснозвездная, 18Б, 4-й этаж, предварительно связавшись с представителем Организатора по телефону +375 44 555 11 66.

Для получения Приза 2 Резервный Победитель должен не позднее 27.05.2020 года прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Краснозвездная, 18Б, 4-й этаж, предварительно связавшись с представителем Организатора по телефону +375 44 555 11 66.

При получении приза Резервный Победитель должен предъявить документ, удостоверяющий личность (действующий паспорт гражданина Республики Беларусь или вид на жительство).

В случае отказа победителя или резервного победителя от получения приза, неполучения приза в установленном правилами порядке и сроке либо невыполнения условий его получения, приз признается невостребованным и остается у Организатора.

В соответствии с главой 16 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении всех Призов выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя приза. При невозможности удержать исчисленную сумму подоходного налога с дохода Победителя по причине отсутствия денежных выплат и (или) отказа плательщика внести причитающиеся суммы подоходного налога с Победителя Организатор обязан в месячный срок со дня выявления указанных фактов направить в налоговый орган по месту жительства плательщика сообщение о сумме задолженности по подоходному налогу с Победителя.

Организатор не несет ответственности за возникновение необходимости уплаты дополнительного подоходного налога и иных выплат, связанных с получением Призов, за пределами Республики Беларусь.

Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения Призов.

Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих Призов.

Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением Призов и их эксплуатацией, возникшие после их передачи Победителям.

**12. Комиссия по проведению Рекламной игры.**

Для контроля за соблюдением Правил, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Соколова Юлия Александровна – менеджер проектов Департамента развития продуктов и процессов для розничных клиентов ЗАО «Альфа-Банк»;

Шелест Анастасия Анатольевна – главный специалист отдела маркетинга и рекламы ЗАО «Альфа-Банк»;

Калитник Татьяна Алексеевна – ООО «ГРУППА КОМПАНИЙ ТДИ», заместитель директора.

Шорр Полина Андреевна – ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», специалист по работе с клиентами.

Жибуль Ольга Олеговна – ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», специалист по работе с клиентами.

**13. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок не позднее 20.06.2020.

Имена победителей Рекламной игры будут размещены на Интернет-сайте Альфа-Банка **www.alfabank.by.**

Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте Альфа-Банка www.alfabank.by, через каналы интернет поддержки, а также по телефону контакт-центра «Альфа-Консультант»: 198, +375 (29, 44, 25) 733 33 32 круглосуточно.

**14. Прочие условия.**

**14.1.** В случае если Победителем является несовершеннолетний, то при получении приза вместе с Участником должны присутствовать его законные представители (родители, усыновители, опекуны, попечители) со своим паспортом (видом на жительство) и свидетельством о рождении либо паспортом несовершеннолетнего.

**14.2**. Организатор не вступает в споры между Участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза, организации и условий передачи Призов. Приз получает победитель. Победитель вправе распорядиться полученным призом по своему усмотрению.

**14.3.** Участие в Рекламной игре автоматически подразумевает ознакомление с полным текстом настоящих Правил и согласие с Правилами. Несоблюдение Участником настоящих Правил считается его отказом от участия в Рекламной игре со всеми вытекающими последствиями (включая утерю права на получение приза и т. п.).

**14.4.** Участники соглашаются на передачу их персональных данных, в т. ч. номера счета, Организатору и разработчику личного кабинета (для целей обеспечения возможности участия Участников в Рекламной игре, а также получения призов).

**14.5.** Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются принимать участие в рекламной видеосъемке, что их фамилии, имена, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Заинтересованному лицу.

**14.6.** Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке по месту нахождения Организатора в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**14.7.** Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору по адресу: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18Б, 4-й этаж.

*Свидетельство № 3710 о государственной регистрации рекламной игры выдано 11 декабря 2019 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

Валерый МАКАРЭВІЧ:

# «МАРА Ў МЯНЕ АДНА — СТАЦЬ ПРАФЕСІЯНАЛАМ СВАЁЙ СПРАВЫ»

## Як варатар зборнай Беларусі па пляжным футболе сумяшчае гульню з роляй настаўніка і бацькі

**Зборная Беларусі па пляжным футболе ў 2019 годзе ўпершыню ў сваёй гісторыі прабілася на чэмпіянат свету. Згуляўшы з сапернікамі з Расіі, ААЭ і Сенегала, беларусы не змаглі выйсці з групы. Тым не менш на сённяшні момант зборная займае 19-е месца ў міжнародным рэйтынгу, апярэджваючы такія краіны як Польшча, Францыя, Германія, Англія і іншыя. Для параўнання: зборная Беларусі па звыклым для балельшчыка, вялікім футболе, знаходзіцца далёка за першай паўсотняй.**

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Валерый Макарэвіч ужо доўгія гады надзейна абараняе вароты нашай дружыны, хоць пачынаў свой шлях у спорце ён у звычайным футболе. Гульню ў «пляжку» сумяшчае з трэнерскай дзейнасцю, у яго актыве ўжо некалькі гадоў вопыту работы трэнерам варатароў у «Крумкачах» і «Тарпеда». Менавіта ў гэтай прафесіі Макарэвіч бачыць сваю будучыню. Пра вынікі чэмпіянату свету ў Парагваі, пра тое, як развіваецца пляжны футбол у Беларусі і дзе працягне сваю кар'еру, Валерый расказаў у інтэрв'ю «Звяздзе».

**— Валерый, спачатку хацелася б даведацца пра вашы ўражанні ад чэмпіянату свету...**

— Яны неверагодныя, не толькі ад таго, што гэта было ўпершыню, але і ад самой арганізацыі. Зборы перад паездкай у Парагвай былі арганізаваны ў Бразіліі, гэта дало магчымасць не толькі правесці добрыя трэніроўкі, але і паглядзець іншую краіну. Усё ж такі Капакабана для пляжнага футбола — гэта крута, Бразілія — найлепшае месца, дзе можна рыхтавацца да чэмпіянату. Там жа мы прайшлі акліматызацыю, не ўяўляю, што было б, калі б яна выпала на сам турнір, бо гэта нервы, недасып, спрэчкі паміж сабой. Што датычыцца надвор'я, то арганізатары добра падабралі час для правядзення турніру. Цяпер у Парагваі стабільнае надвор'е, якое не перашкаджала. Падчас гульняў спякота спадала, таму мы адчувалі сябе камфортна. Але на трэніроўках перад чэмпіянатам свету пясок на полі быў настолькі гарачы, што прыходзілася яго паліваць, а некаторыя нават завязвалі ступні, каб не спаліць скуру на падэшве. Бывалі і адваротныя выпадкі з надвор'ем: на САК «Алімпійскі» ў Мінску, напрыклад, мы трэніраваліся і падчас снегападу. Пляжны футбол — гэта самы неверагодны від спорту, які прыносіць толькі задавальненне *(усміхаецца)*.

**— Ад саміх гульняў і іх вынікаў ўражанні, напэўна, засталіся двайкія?**

— Кіраўніцтва не ставіла перад намі неверагодных задач, але ўсе хлопцы былі настроеныя на тое, каб, як мінімум, выйсці з групы і пазмагацца з сапернікамі, якія трапяцца ў чвэрцьфінале. Разумелі, што там нас чакалі альбо бразільцы, альбо партугальцы. Вядома, мы разлічвалі на большае, але з некаторых прычын не атрымалася. Гэта, усё ж такі, першы вопыт выступлення на чэмпіянаце свету, таму, магчыма, паўплывала нейкае напружанне. Мы сустрэліся з невядомымі сапернікамі, такімі, напрыклад, як Сенегал. Раней у каманды не было вопыту настолькі адказных гульняў.

**— Што стала самым нечаканым на гэтым чэмпіянаце?**

— Гульня з Сенегалам. Здаецца, трэнер падказаў, як правільна паводзіць сябе, але мы сустрэліся з нечаканасцю ў тым плане, што сенегальцы вельмі моцныя фізічна. Здаецца, выконвалі ўсё, аб чым нас прасіў трэнер, але так атрымалася, што гэтага не хапіла, і ўдача была не на нашым баку. Па статыстыцы гульня з Сенегалам — адна з найлепшых у плане атакі, але то варатар выратоўваў, то мяч трапляў у каркас варот. Таксама паўплывалі памылкі, якія з'явіліся ад таго, што мы імкнуліся хутчэй забіць, мабыць, трэба было быць спакайнейшымі. Гульня выслізнула з нашых рук, асабліва ў трэцім перыядзе, мы ўжо не верылі, што можам вярнуцца.

**— Раскажыце, у чым адрозненне гульні варатара ў звычайным футболе і пляжным?**

— У пляжным футболе ён заўсёды ў справе, не выключаецца ні на секунду, таму што ад яго залежыць і развіццё нападзення, і яго падрыхтоўка, і абарона, гэта значыць, кожную секунду трэба быць напагатове. У вялікім футболе, калі мяч на іншай палове поля, ты можаш проста назіраць або заняцца кіраваннем камандай. Таксама ў варатара пляжнага футбола павінна быць вельмі добрая тэхніка, бо ў нас больш гульні нагамі.

**— Што скажаце пра развіццё пляжнага футбола ў Беларусі?**

— Што датычыцца зборнай, яе рост і развіццё відаць няўзброеным вокам, нават па выніках. Што датычыцца чэмпіянату краіны, ён губляе ўзровень, які быў калісьці, і з гэтым трэба нешта рабіць. Напрыклад, запрашаць маладых людзей, каб займаліся футболам, каб расло новае пакаленне. У краіне сёння няма прафесійных камандаў, якія маглі б утрымліваць хлопцаў хоць бы паўгода, не кажучы ўжо аб поўным сезоне. На жаль, я не бачу руху ў гэтым напрамку і ў найбліжэйшай будучыні, калі сыдуць цяперашнія гульцы, думаю, зборная страціць шмат пунктаў у рэйтынгу.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**— Казалі, што папулярызацыі вашага віду спорту могуць паспрыяць Еўрапейскія гульні ў Мінску...**

— Але наш вынік там быў не вельмі ўдалы. Калі па праўдзе, гуляць перад сваімі балельшчыкамі вельмі складана, адказнасць за вынік не вельмі станоўча адбіваецца на нашай гульні. Пасля няўдалага выступлення, вядома, ніхто і не кажа пра будаўніцтва манежа ці новых пляцовак.

**— Усе гульцы зборнай па пляжным футболе акрамя спорту яшчэ і працуюць?**

— Не, толькі некаторыя, напрыклад, у нашай камандзе ёсць чалавек з МНС, які ратуе людзей, ёсць дырэктар буйной фірмы і яшчэ шмат розных прафесій.

**— Перад Еўрапейскімі гульнямі вы спынялі сваю кар'еру...**

— Так, але пасля размовы са старшынёй федэрацыі пляжнага футбола, вырашыў вярнуцца, каб выступіць на Еўрапейскіх гульнях. Потым у нас быў адбор на чэмпіянат свету, так супала, што якраз у гэты час з-за фінансавых праблем быў ліквідаваны мінскі клуб «Тарпеда», у якім я працаваў. Мы ўпершыню атрымалі пуцёўку на чэмпіянат свету, таму мне не хацелася спыняцца, была дамоўленасць да канца гэтага года ўсё ж такі дагуляць у пляжны футбол і вярнуцца да размовы пра маю далейшую перспектыву ўжо пасля чэмпіянату свету. Што датычыцца клубнай кар'еры, то сёлета я быў гульцом «Крылаў Саветаў», але трэнер, які кіраваў камандай, сыходзіць. Ён ужо паведаміў, што хацеў бы бачыць мяне ў складзе сваёй новай каманды, але канкрэтыкі пакуль няма, да старту чэмпіянату Расіі яшчэ далёка. Спадзяюся, што знайду каманду, але хацелася б нейкай падтрымкі ад нашай федэрацыі і Мінспорту, каб мы ўсё ж такі былі не аматарамі. Калі гэта атрымаецца, думаю, застануся, калі не, то буду шукаць месца работы ў вялікім футболе, усё ж такі, у мяне ўжо ёсць два гады вопыту працы трэнерам варатароў.

**— Шкадуеце, што ў вялікім футболе ў вас не атрымалася доўгай кар'еры?**

— З аднаго боку, так, а з другога, не. Таму што, тое, чаго я дасягнуў у пляжным футболе, пераважвае. Я ўбачыў шмат краін, і ў плане развіцця светапогляду гэта вельмі паўплывала на мяне. Я сустрэў пэўных людзей у жыцці, дзякуючы гэтаму віду спорту. Не ведаю, кім бы быў, калі б не пляжны футбол, думаю, пра гэта нават не трэба разважаць. Лічу, што калі ў мяне не атрымалася ў ролі гульца, то атрымаецца рэалізаваць сябе ў ролі трэнера.

**— У трэнерскай дзейнасці вы адчуваеце сябе на сваім месцы?**

— Так, мне вельмі падабаецца. За гэтым, хутчэй за ўсё, мая будучыня. Вельмі ўплывае тое, што я не забіў усе эмоцыі, якія адчуваеш, калі сам гуляеш у футбол, таму цалкам яшчэ не пераключыўся. Думаю, трэнерства — гэта маё прызначэнне. З дзецьмі працаваць вельмі цяжка, я ўжо спрабаваў, хоць усё залежыць менавіта ад дзіцячых трэнераў, якія павінны навучыць гульца ўсяму таму, што ён павінен умець ужо ў прафесійным футболе. Дзіцячыя трэнеры павінны быць вельмі адукаванымі, фанатычна адданымі сваёй працы. У рабоце з дарослымі больш тэхнічных момантаў, ёсць свае асаблівасці, складанасці, душа ў мяне ляжыць больш да дарослага футбола. Не ведаю, як атрымаецца, буду я працаваць толькі з варатарамі або стану калі-небудзь галоўным трэнерам. Пакуль збіраюся атрымліваць яшчэ адну адукацыю ў трэнерстве. А мара ў мяне адна — стаць прафесіяналам сваёй справы. Каб людзі, з якімі я працую, мелі пэўны прагрэс і рухаліся далей, а не сказалі: маўляў, трэнер зрабіў усё, каб я скончыў сваю кар'еру. Буду стараццца, каб маіх ведаў станавілася больш, і было, што перадаць падначаленым.

**— На ваш погляд, якую ролю трэнер адыгрывае ў кар'еры спартсмена?**

— Не скажу, што самую галоўную, але гэта чалавек, які вельмі ўплывае. Я ўсё ж такі схіляюся да таго, што ўсё залежыць ад спартсмена, але трэнер дае напрамак, у якім рухацца. Калі футбаліст прыслухоўваецца, калі ён адказны і сам прагне прагрэсу, то заўсёды даможацца сваёй мэты.

**— У вас трое дзяцей, наколькі атрымліваецца сумяшчаць кар'еру спартсмена, трэнера і ролю бацькі?**

— Вельмі сумую па дзецях у доўгіх паездках, напрыклад, як цяпер падчас чэмпіянату свету. Гэта цяжка і для іх, і для мяне. У нашай сям'і так склалася, што мы з жонкай разам займаемся іх выхаваннем, я больш часу аддаю асвеце. Мне прыносіць гэта вялікае задавальненне, падабаецца чытаць кнігі з дзецьмі, хадзіць у тэатр і кінатэатр. Гэта вельмі цяжкая праца, але калі я дома, то імкнуся ўсім гэтым займацца.

# Максім Мірны ў ліку кандыдатаў на абранне ў камісію атлетаў МАК

**Такое рашэнне агучана на пасяджэнні выканкама Міжнароднага алімпійскага камітэта ў Лазане. Абранне новых 30 членаў камісіі атлетаў адбудзецца ў 2020 годзе падчас летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа.**

«Я атрымаў радасную вестку: мая кандыдатура намінавана ў лік кандыдатаў на абранне ў камісію спартсменаў МАК. У сувязі з гэтым, у першую чаргу, я ўдзячны Нацыянальнаму алімпійскаму камітэту Беларусі, які прапанаваў маю кандыдатуру. Шчыра кажучы, гэта было маёй дзіцячай марай — быць задзейнічаным у алімпійскім руху. Для мяне было велізарным гонарам прадстаўляць нашу краіну ў ролі спартсмена на Алімпіядах. І будзе велізарным гонарам прадстаўляць Беларусь на міжнароднай арэне ў выпадку майго абрання», — падзяліўся сваімі ўражаннямі Максім Мірны.

Раней ад Беларусі на ўключэнне ў камісію атлетаў МАК прэтэндаваў фрыстайліст Дзмітрый Дашчынскі. Камісія атлетаў прадстаўляе інтарэсы спартсменаў на Гульнях. Яна з'яўляецца свайго роду злучальным звяном паміж спартсменамі і кіраўніцтвам МАК. Асноўнай місіяй камісіі з'яўляецца гарантыя таго, каб меркаванне спартсменаў было ключавым пры прыняцці рашэнняў у сферы алімпійскага руху. Члены камісіі таксама прымаюць удзел у ацэнцы гарадоў — кандыдатаў на правядзенне Гульняў, сочаць за іх арганізацыяй і прымаюць удзел у ацэнцы алімпійскай спартыўнай праграмы.

# І МЫ ЎНЕСЛІ СВОЙ УКЛАД

## У Мінскай гарадской ратушы былі падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу «Энергія яркіх перамог»

**Ён праводзіўся сярод спартыўных журналістаў на найлепшае асвятленне ходу падрыхтоўкі і ўдзелу беларускіх спартсменаў у II Еўрапейскіх гульнях.**

Спецыяльным прызам Беларускай федэрацыі баскетбола і Беларускай асацыяцыі спартыўнай прэсы за ўклад у асвятленне Гульняў і баскетбола 3х3 на беларускай мове, а таксама падзякай ад прэм'ер-міністра Беларусі за актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні мультыспартыўнага турніру адзначана спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» ЛАБАЖЭВІЧ Дар'я.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Беларускія журналісты ўнеслі свой уклад у пашырэнне дасягненняў нашых спартсменаў і Рэспублікі Беларусь ва ўсім свеце, і зрабілі гэта годна», — адзначыў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.** Ён падкрэсліў, што ў лісце, які быў накіраваны на імя Прэзідэнта Беларусі і Прэзідэнта НАК Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ад імя Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў, адзначана, што згодна з медыяаналізам Гульняў з пункту гледжання асвятлення ў СМІ турнір знайшоў шырокае асвятленне ва ўсім свеце. Аб мерапрыемстве было створана 55 тысяч матэрыялаў анлайн, увогуле — 35 мільярдаў згадак у медыя. 69 працэнтаў артыкулаў апублікавана падчас Гульняў, што забяспечыла значную канцэнтрацыю і дынаміку кантэнту і ўзмацніла значнасць падзеі.

Арганізатарамі конкурсу выступілі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Беларуская асацыяцыя спартыўнай прэсы, пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў-2019» і Беларускай федэрацыі баскетбола, Музея гісторыі горада Мінска, КУП «Спадчына».

Хакей

# ШАНЦАЎ БОЛЬШ НЯМА

## За два туры да заканчэння чэмпіянату Беларусь практычна выбыла з барацьбы за эліту

**Маладзёжны чэмпіянат свету па хакеі, які працягваецца ў Мінску, вынікамі трэцяга тура прынёс негатыўныя эмоцыі беларусам. У другі гульнявы дзень падапечныя Дзмітрыя Дудзіка ў авертайме саступілі сваім галоўным канкурэнтам — латвійцам, а на наступны дзень, практычна паўтарыўшы сцэнарый папярэдняга матча, прайгралі і нарвежцам. Такім чынам, выйсці ў эліту зборнай Беларусі мог дапамагчы толькі ўдалы збег абставін.**

«На здзіўленне, другі авертайм запар прайграём, маючы ў складзе майстравітых хакеістаў, якія па ўсіх прыкідках павінны выкарыстоўваць свабодную прастору пры гульні «тры на тры», — каментуе матч з нарвежцамі **галоўны трэнер** беларускай «маладзёжкі» **Дзмітрый ДУДЗІК.** — Так, узнікае аналогія з апошнім гульнёй на мінулым чэмпіянаце свету з той жа зборнай Латвіі, калі прайграўшы асноўны матч немцам, мы бязвольна саступілі яшчэ і латышам. Нешта падобнае адчуваецца і ў нашых хакеістаў, што адбіваецца на якасці гульні. Вельмі шмат спрабуем згуляць па «чыстым» лёдзе і пазбягаем барацьбы. Змагаемся з гэтым. Пастараемся ў апошніх матчах прыбраць гэтую боязь і абыякавасць. На жаль, не веру ў нашы шанцы на выхад. Я знаходжуся ўнутры калектыву і бачу... Не хачу крытыкаваць гульцоў зараз, ды і не буду крытыкаваць, трэба пераасэнсаваць, для чаго гульцам зборная, навошта яны сюды трапілі. Што важней, сваё асабістае «Я», нейкія незразумелыя амбіцыі, засвяціцца перад скаўтамі ці ўсё-такі каманда, краіна, балельшчыкі? Пакуль з гэтым праблема. Магчыма, таму што гульцы яшчэ маладыя і няправільна расстаўляюць прыярытэты».

«Быццам настройваліся, усе нас падбадзёрвалі, але выйшлі — і як быццам усё супраць нас, — расказвае **нападаючы нашай зборнай Ягор БУЯЛЬСКІ.** — Хочацца папрасіць прабачэння перад роднымі балельшчыкамі ў першую чаргу. На нас нічога не ціснула. Выходзячы на кожную гульню, мы хацелі выйграваць, але штосьці не ідзе. Не ведаю, з чым гэта звязана. Трэба выйграваць усе матчы, усё ж такі выступаем дома. Так гуляць не дазваляецца, цяпер усе засмучаныя, у раздзявалцы цішыня».

У пятніцу латвійцы згулялі з аўстрыйцамі, нарвежцы з датчанамі і беларусы са славенцамі. Заўтра адбудуцца заключныя матчы турніру.

# «ЯЕ СВЕТ, ЯЕ ПРАВІЛЫ»

## У Беларусі стартаваў адбор будучых зорак жаночай нацыянальнай зборнай па баскетболе

**У рамках сумеснага праекта ФІБА Еўропа і Беларускай федэрацыі баскетбола «Яе свет, яе правілы» ў шасці гарадах нашай краіны праходзіць адбор найбольш перспектыўных дзяўчат-баскетбалістак 2007—2008 гадоў нараджэння. Рэспубліканская акцыя стартавала 11 снежня.**

«Маштабны праект праводзіцца ў Беларусі ўпершыню і асноўная яго мэта — стварэнне надзейнага рэзерву для жаночай нацыянальнай зборнай, — тлумачыць **выканаўчы дырэктар-генеральны сакратар БФБ Настасся МАРЫНІНА.** — Задачы, якія стаяць перад спецыялістамі — агульнанацыянальная селекцыя таленавітых спартсменак для далейшай кропкавай работы з кожнай з іх, а таксама матывацыя трэнераў, якія вядуць наборы ў групы пачатковай падрыхтоўкі. Гэтая важная і няпростая работа ажыццяўляецца намаганнямі створанай экспертнай групы, якая складаецца з айчынных спецыялістаў. Узначальвае яе галоўны трэнер жаночай нацыянальнай зборнай Беларусі Наталля Трафімава. Асноўны ўпор зроблены на высакаросłых гульцоў і разыгрываючых. Плануецца, што на фінальным этапе, які пройдзе ў студзені 2020 года, да праекта далучацца і замежныя эксперты. Набор гульцоў 2007—2008 гадоў — вельмі цікавы. Трэнеры і ў рэгіёнах, і ў Мінску зрабілі выдатную работу. Адзначым, што многія дзяўчаты прыйшлі летась у секцыі, натхніўшыся змаганнямі чэмпіянату свету па баскетболе сярод спартсменак да 17 гадоў, які прайшоў у Мінску. Аднак, на жаль, ёсць і выключэнні. Віцебская абласная федэрацыя прыняла рашэнне аб немэтазгоднасці правядзення адбору, матывуючы гэта «адсутнасцю згаданага ўзросту ў вобласці». А менавіта гэты рэгіён, адкуль родам Таццяна Белашапка, Аляксандр Куль, Мікалай Аляксееў, Анатоль Якубенка, заўсёды славіўся высакаросłымі гульцамі. Таму прынята рашэнне, што ўсе ахвотныя змогуць прыняць удзел у туры, які адбудзецца ў Магілёве».

У экспертную групу ўвайшлі: галоўны трэнер жаночай нацыянальнай каманды Наталля Трафімава, галоўны трэнер нацыянальнай жаночай каманды 3х3 Юрый Воўк, алімпійская чэмпіёнка Таццяна Белашапка, заслужаныя трэнеры Беларусі Рэгіна Пышнік і Аляксандр Барысаў, трэнеры маладзёжных жаночых камандаў U-13, U-16, U-18, U-20 Алена Навойчык, Вікторыя Дацун, Надзея Камянец і Валянціна Навойчык (адпаведна), менеджар нацыянальнай жаночай каманды Аляксандр Кудраўцаў.

Па выніках рэгіянальных этапаў перспектыўныя баскетбалісткі і іх трэнеры будуць запрошаныя на фінальны тур, у рамках якога адбудзецца трэніровачны кэмп з прыцягненнем спецыялістаў РНПЦ спорту і НАДА. Акрамя тэарэтычных і практычных заняткаў па баскетболе, а таксама спаборніцкай практыкі дзяўчаты пазнаёмяцца з асаблівасцямі харчавання спартсменаў, антыдопінгавымі правіламі, асноўнымі аспектамі судзейства.

— На кожным этапе будзе арганізаваны конкурс баскетбольнага майстэрства, турнір 3х3, а таксама майстар-клас ад зорных гульцоў жаночай зборнай краіны, — расказала **галоўны менеджар праекта Лізавета ФАМІНА.** — Плануецца, што сакрэтамі баскетбольнага майстэрства з дзяўчатамі падзеляцца Настасся Верамеенка, Вольга Зюзькова, Вікторыя Гаспер, Арына Масько, Яніна Інкіна, а таксама экс-цэнтравая нацкаманды Марына Крэс.

Праграма ФІБА Еўропа «Her World, Her Rules» (Яе свет, яе правілы), якая стартавала вясной 2019 года, накіравана на падтрымку і прасоўванне дзяўчат і жанчын у еўрапейскай баскетбольнай супольнасці. 9 лістапада 2019 года ФІБА Еўропа абвясціла аб далейшым маштабным развіцці згаданага праекта аж да 2021 года, бюджэт якога складзе адзін мільён еўра.

Адборачныя этапы ўжо прайшлі ў Мінску і Барысаве, 16 снежня «прагляд» адбудзецца ў Магілёве, 17 — у Гомелі, 18 — у Гродне, 19 снежня — у Брэсце. Фінальны этап, удзельнікамі якога стануць найлепшыя баскетбалісткі па выніках рэгіянальных адбораў, пройдзе ў Мінску ў сярэдзіне студзеня 2020 года.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

belarus.basktball

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукционов по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов (для размещения объектов усадебной застройки)

| Участки | № 1 | № 2 |
|---|---|---|
| Местонахождение земельного участка | г. Ошмяны, ул. Песчаная, 12 | г. Ошмяны, ул. Золотарева, 13 |
| Площадь земельного участка, га | 0,1204 | 0,1020 |
| Кадастровый номер участка | 424950100001003235 | 424950100001003196 |
| Вещное право | частная собственность | |
| Целевое назначение участка | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | |
| Наличие инженерных коммуникаций | электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение | электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, канализация |
| Наличие ограничений прав на земельный участок | расположение в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора на площади 0,1204 га | расположение в охранной зоне электрических сетей на площади 0,0015 га |
| Особые условия аукциона | нет | нет |
| Начальная цена предмета аукциона, рублей | **8500** | **6000** |
| Сумма задатка, рублей | **850** | **600** |
| Дата проведения аукциона | 17 января 2020 г. | |
| Место проведения аукциона | каб. 71, 5-й этаж, г. Ошмяны, ул. Советская, 103 | |
| Время проведения аукциона | 11.00 | 11.30 |
| Последний срок подачи заявлений на участие в аукционе | 14 января 2020 г. до 17.00 | |
| Расходы на подготовку документации для аукциона, рублей | 1694,09 | 1488,76 |

Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь (далее – граждане).
Гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении срок подает заявление об участии в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который он желает приобрести в частную собственность, а также заверенную копию платежного поручения о внесении суммы задатка, а также заключает с Ошмянским районным исполнительным комитетом соглашение.
Кроме того, представляются:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Заявления для участия в аукционе принимаются с момента публикации данного извещения в печатных СМИ, с предоставлением документа, подтверждающего внесение суммы задатка, по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 103, кабинет 70, с 8.00 до 17.00, кроме обеденного перерыва с 13.00 до 14.00, контактные телефоны: (801593) 4-21-69, 4-32-18, 4-35-85.
Сумма задатка для участия в аукционе перечисляется на специальный счет Ошмянского райисполкома № BY43AKBB36415230009794200000, УНН 500088419, в ЦБУ № 418 г. Ошмяны филиала № 413 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Лида, БИК AKBBBY21413, получатель – Ошмянский райисполком, назначение платежа – внесение задатка для участия в аукционе.
Осмотр на местности земельных участков осуществляется в рабочее время с 8.00 до 17.00 (по требованию), кроме обеденного перерыва с 13.00. до 14.00.
Аукцион проводится при наличии не менее двух участников в порядке в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, публикацией извещений в средствах массовой информации

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Коралл» (продавец) извещает о проведении 30 декабря 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-208007 протяженностью 103,0 м,** назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **автодорога участка пакетировки.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000002003192** площадью **0,3387 га** – для содержания и обслуживания зданий и сооружений **(право аренды)**. **Местонахождение:** г. Гомель, ул. Лепешинского, 7 | **8364,11** | 836,41 |

**Продавец:** ОАО «Коралл», г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (0232) 25-64-22, 8 (029) 124-12-84 – Шельмонский Юрий Сергеевич. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Коралл»):** р/с BY52 BPSB 3012 1118 8901 993 30000 в Региональной дирекции № 300 ОАО «БПС Сбербанк», BIC BPSBBY2X, УНП 400051785, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 14 декабря 2019 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов) заканчивается 27 декабря 2019 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 **(три)** дня до его проведения.
**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только **единственным** участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 01.10.2019 г. № 186 (29053). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, на сайте www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

## Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Строительно-монтажный трест № 19» (Гродненская область, г. Лида, ул. Рыбиновского, д. 22) 14 января 2020 года

| | |
|---|---|
| **Вид аукциона (открытый)** | Лот № 1* |
| **Предмет аукциона** | Изолированное помещение с инвентарным номером 420/D-помещение многофункциональное общей площадью 588,8 кв. м. Год постройки – 1987. Количество этажей – 1. Материал стен – кирпич, силикатные блоки |
| **Начальная цена продажи** | **302 400,00 руб.** (с учетом НДС 20 %) |
| **Кадастровый номер земельного участка и размеры** | 441300000006000062, 0,6652 га |
| **Месторасположение земельного участка** | Гродненская область, Лидский район, г. Лида, ул. Рыбиновского, д. 22 |
| **Имущественное право земельного участка** | Право постоянного пользования (316/5129 доли) |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество «Строительно-монтажный трест № 19», Гродненская область, г. Лида, ул. Замковая, 4, тел.: 8 (0154) 522712, 645716 |
| **Сумма задатка** | 30 240,00 руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010 |
| **Дата проведения аукциона** | 14 января 2020 года |
| **Время проведения аукциона** | 12.00 |
| **Место проведения аукциона** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал |
| **Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 |
| **Дата и время начала приема документов** | 16 декабря 2019 года, 8.00 |
| **Дата и время окончания приема документов** | 8 января 2020 года, 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении задатка за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».
Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 20 дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
**Адрес сайта: www.grodno.gov.by, gcn.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Предмет торгов**:
У графстве Уілтшыр, тым самым, дзе знаходзяцца Стоўнхэндж і горад Солсберы, меўся выбарчы ўчастак, у якім людзей не было наогул. Былі адны авечкі. Пры гэтым на працягу 130 гадоў ён спраўна пастаўляў у Палату абшчын двух парламентарыяў. Гэта стала магчымым дзякуючы слаўнай брытанскай бюракратыі, якая шчасна існавала разам з не менш слаўнай брытанскай дэмакратыяй, іранізуе Бі-бі-сі. Калісьці была ў гэтай акрузе вёсачка, у якой, паводле афіцыйных папер, жылі 11 чалавек. Насамрэч, яны там ужо даўно не жылі, і адзінымі «выбаршчыкамі» былі авечкі. Напэўна, і свінні таксама, Уілтшыр імі якраз і знакаміты. Але вёска па паперах лічылася заселенай, а значыць, яе варта было прадстаўляць у Палаце абшчын. У выніку за кожны зямельны ўчастак, які дае права на вылучэнне кандыдата, ішла самая сапраўдная вайна. За адзін з іх, напрыклад, было аддадзена 60 тысяч фунтаў, тады як сапраўдны кошт яго быў дзесьці фунтаў 700. Калі перавесці гэтыя 60 тысяч на сучасныя грошы, атрымаецца некалькі дзясяткаў мільёнаў.

Дасціпныя выбарчыя ўлёткі, а таксама перадвыбарныя куплеты карысталіся вялікай папулярнасцю. Добрым тонам лічылася перарабіць усім вядомыя патрыятычныя спевы на актуальны лад. Напрыклад, адзін кандыдат па імені Роберт (Боб) выступаў за скасаванне манархіі. Замест слоў нацыянальнага гімна God Save the King (Божа, ахоўвай караля) спявалася: «Bob Shave the King (Боб, пагаліў караля)». Ідыёма была зусім не нявінная і азначала: «Боб, адрэж яму галаву!»

Сацсетак тады, канешне ж, не было. Не было нават мікрафонаў. Кандыдатам, якія жадалі павысіць сваю папулярнасць, патрабавалася перакрычаць велізарны натоўп, які далёка не заўсёды быў добразычлівы. Вядома, калі кандыдат быў свой, то яго маглі сустракаць вітальнымі крыкамі. Ну, а непажаданым даводзілася дрэнна. Не абцяжарваючыся правіламі добрых паводзін, грамадзяне кідалі ў прамоўцаў здохлых катоў, сабак, а таксама сабачыя экскрэменты і нават камяні.

Як паведаміла Бі-бі-сі, асабняк на Даўнінг-стрыт, у якім знаходзіцца афіцыйная рэзідэнцыя прэм'ер-міністра, не заўсёды існаваў пад нумарам 10. Спачатку ён фігураваў пад нумарам 5. Потым нумары ператасавалі. Чаму так адбылося, ніхто дакладна не ведае. Але першым насельнікам дома 10 (ці 5) быў той самы першы прэм'ер, які тады яшчэ прэм'ерам не называўся, Роберт Уолпал. Цікава, што над шчылінай для лістоў дагэтуль вісіць латуневая шыльдачка з яго афіцыйным тытулам: «Першы лорд казначэйства».

### БОТЫ ПЯРА

З «брэксітам» у Туманным Альбіёне ўсё закруцілася тры з паловай гады таму, калі 23 чэрвеня 2016-га адбыўся рэферэндум адносна членства Вялікабрытаніі ў Еўрапейскім Саюзе, на якім 51,9 працэнта выбаршчыкаў выказалі жаданне пакінуць ЕС. Пасля гэтага прэм'ер-міністр Дэвід Кэмеран сышоў у адстаўку, а новым кіраўніком урада стала Тэрэза Мэй, якая запусціла працэс «брэксіту». У чэрвені 2017 года прайшлі датэрміновыя выбары, у выніку якіх Мэй захавала за сабой пасаду. Аднак з-за праблем з «брэксітам» яна таксама сышла ў адстаўку ў маі 2019-га. А ў ліпені новым лідарам кансерватыўнай партыі быў абраны Борыс Джонсан, які таксама заняў пасаду прэм'ер-міністра.

Стаўшы кіраўніком урада, Джонсан тройчы прапаноўваў правесці датэрміновыя выбары, аднак кожны раз Палата абшчын адмаўляла яму ў гэтым. У выніку адпаведны законапраект быў прапанаваны ліберальна-дэмакратычнай і Шатландскай нацыянальнай партыямі 28 кастрычніка, ужо на наступны дзень ён быў ухвалены урадам (за выключэннем дня правядзення выбараў, бо першапачаткова прапаноўвалася правесці іх 9 снежня, а ў выніку яны былі прызначаныя на 12-е). Папраўка, якая змяняе дату на 9 снежня, не прайшла з перавагай у 315 галасоў супраць 295. Канчатковае рашэнне па законапраекце было прынята 438 галасамі супраць 20. 12 снежня выбаршчыкі Злучанага Каралеўства адправіліся на ўчасткі, каб выбраць новы парламент, а значыць, і прэм'ера гадоў ён адваёўвае ў лейбарыстаў Лондан і застаецца на пасадзе мэра два тэрміны, арганізаваўшы ў тым ліку Алімпійскія гульні — 2012. Затым, як нічога ніякага, вяртаецца ў нацыянальную палітыку, стаўшы тварам выбарчай кампаніі Тэрэзы Мэй і ўзначаліўшы знешнепалітычнае ведамства. Калі ж сёлета 7 чэрвеня Мэй склала з сябе паўнамоцтвы, страціўшы надзею дабіцца ад парламента адабрэння здзелкі па «брэксіце», у кансерватыўнай парламенцкай большасці не было іншай кандыдатуры на крэсла прэм'ера, акрамя Борыса Джонсана. Снежаньская палітычная кампанія, якую Бі-бі-сі параўнала з прэзідэнцкімі выбарамі ў Злучаных Штатах, паказала, што яму і надалей спадарожнічае поспех. Дарэчы, першым з перамогай (яшчэ да абвяшчэння афіцыйных вынікаў) Джонсана павіншаваў менавіта прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. Пра гэта ён напісаў у сваім Twitter. «Выглядае як вялікая перамога для Борыса ў Вялікабрытаніі!» — адзначыў амерыканскі лідар.

### ПАД ШЧАСЛІВАЙ ЗОРКАЙ

Характар — гэта лёс, могуць сказаць пра Борыса Джонсана палітолагі, якія шмат гадоў назіралі за тым, як ён упарта ішоў да пастаўленай мэты, заўважыла Euronews. Нягледзячы на няўдачы, запаветная дзверы прэм'ерскай рэзідэнцыі на Даўнінг-стрыт,10 адчыніліся-такі перад ім 24 ліпеня 2019 года. Мэр Лондана з 2008-га да 2016 года і міністр замежных спраў у першым і другім кабінетах Тэрэзы Мэй, Джонсан перасеў у крэсла кіраўніка ўрада ў момант, калі крызіс з выхадам Вялікабрытаніі з ЕС стаў прымаць зацяжны характар.

Вядомы блізкім і сябрам як Аляксандр Борыс дэ Пфефель-Джонсан, ён даволі рана выбраў для палітычнай кар'еры другое імя, якое хутка стала вядомым. Джонсан нарадзіўся ў Нью-Ёрку, у сям'і інтэлектуалаў. Яго прадзед па бацьку — турэцкі журналіст Алі Кемаль — быў пакараны пасля прыходу да ўлады Ататюрка. Борыс Джонсан, які атрымаў выдатную адукацыю ў Вялікабрытаніі, таксама пачынаў у журналістыцы. Ён працаваў карэспандэнтам Daily Telegraph у Бруселі і набыў вядомасць, дзякуючы яркаму стылю і рэзкім еўраскептычным артыкулам.

Калі ў 2001 годзе Джонсан абіраецца ў Палату абшчын ад Кансерватыўнай партыі па акрузе Хенлі, яго харызматычная асоба ўжо добра вядомая брытанцам. Аглядальнікі падкрэсліваюць, што з самага пачатку яму спадарожнічае поспех: калі ў сярэдзіне 2000-х становіцца вядома аб тым, што ён хлусіў пра пазашлюбную сувязь, знаходзячыся ў шлюбе з Кэтрын Уілер і быўшы бацькам чацвярых дзяцей, гэта каштуе яму месца ў «ценявым кабінеце», але не азначае канца палітычнай кар'еры, як магло адбыцца з кім-небудзь іншым. Больш за тое, праз некалькі

### «РАЗВОД» ДА КАЛЯДАЎ

Ключавым пытаннем цяперашняй выбарчай кампаніі стала, несумненна, праблема «брэксіту». Джонсан пры гэтым настойвае, што ўхваленне цяперашняга пагадненя дазволіць Вялікабрытаніі вярнуць кантроль над заканадаўствам, фінансамі і міграцыйнай палітыкай. Прэм'ер лічыць, што перамога кансерватараў на выбарах азначае канчатковае рашэнне па «брэксіце», што прывядзе да ўсплёску замежных інвестыцый. Джонсан спасылаецца на даследаванне Goldman Sachs, па выніках якога зроблена выснова, што 150 млрд фунтаў стэрлінгаў ($192 млрд) будуць разблакаваныя.

Торы, акрамя ўсяго іншага, атрымалі большасць і ў мностве былых рабочых акруг на поўначы і ў цэнтры краіны, дзе выбаршчыкі традыцыйна галасавалі за лейбарыстаў, але на рэферэндуме 2016-га ў большасці выказаліся за выхад з Еўрасаюза. Сам 70-гадовы Джэрэмі Корбін пасля аб'явы аб выніках па яго лонданскай акрузе сказаў, што на наступныя выбары партыю не павядзе. Адметна, што перамогу партыі Джонсана дружна прадказвалі сацыёлагі. Яшчэ адзін выразны сігнал — вокладка самай тыражнай газеты краіны The Sun. Каго падтрымлівае яе ўладальнік Руперт Мердак, той практычна заўсёды і выйграе. Цяпер выданне адназначна выказалася за Кансерватыўную партыю.

Што ж далей? Борыс Джонсан мае намер ужо да 25 снежня накіраваць у парламент на галасаванне пагадненне па «брэксіце», узгодненае ў кастрычніку з ЕС. Акрамя гэтага, у сваім выбарчым маніфесце прэм'ер паабяцаў узмацніць унутраную бяспеку Вялікабрытаніі з дапамогай пашырэння штатаў паліцыі на 20 тысяч чалавек. Таксама ён мяркуе павялічыць бюджэт Нацыянальнай службы аховы здароўя Вялікабрытаніі, накіроўваць больш сродкаў на ўтрыманне дзяржаўных школ, заняцца рэканструкцыяй дарог і мерамі па павышэнні энергаэфектыўнасці. Рэалізаваць усе гэтыя намеры цяпер будзе значна прасцей, паколькі ў кансерватараў — перакананчая парламенцкая большасць.

**Захар БУРАК.**

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 44 (486)



Фестываль

# КАРОТКІ МЕТР ВЫРАШАЕ

## Мы з'ездзілі ў Беласток на кінафестываль Żubroffka і раім вам у наступным годзе адправіцца туды самім

**Што гэта за горад з насельніцтвам толькі трыста тысяч чалавек і што гэта за кінафестываль, на начных паказах якога ў гэтым горадзе гледачы ледзь не звісаюць са століяў і барнай стойкі. У мінулую нядзелю ў Беластоку падвёў вынікі 14-ы міжнародны фестываль кароткаметражных фільмаў Żubroffka, дзе апроч іншага паказвалася асобная праграма беларускіх карцін, а ў конкурсах дзіцячых фільмаў удзельнічала беларуская анімацыя. Папярэджваючы пытанні, зброўку на кінапаказах не раздаюць, хоць чуткі ходзяць, што гэта адзін з самых пітушчых кінафестываляў у свеце (у кінематаграфістаў часам своеасаблівыя крытэрыі ацэнкі). Чуткі каментаваць не буду, але пра саму Żubroffku ў мяне нешта ёсць.**

Z

Калі паказы на пэўным кінафестывалі збіраюць поўныя ці прынамсі амаль поўныя залы, праўда ж, складана сказаць, гэта заслуга культурнай публікі ці PR-службы? У гэтым выпадку альбо ў Беластоку надзвычай культурная публіка, альбо ў фестывалю Żubroffka добры піяр, альбо ўсё разам. Стаўлю на «ўсё разам»: хіповы фестываль, як мне падалося, мае цэлы шэраг казырных картаў, у прыватнасці, хоць гэта амаль што відавочна, добрае кіно і — трэба вылучыць асобна — выкшталцоныя формы яго «падачы».

Што за добрае кіно? — апроч беларускага, якое ўвайшло ў шырокі пазаконкурс, Żubroffka паказала прыгожа рознаабліччную конкурсную праграму, куды былі ўключаны замежныя карціны і даволі фільмаў з Польшчы. Некалькі конкурсаў кіно для дзяцей ад шасці, дзесяці і трынаццаці гадоў, праграмы стужак з усяго свету і секцыі выключна польскіх работ, асобна — аматары, асобна — студэнты, асобна — незалежныя фільмы, нарэшце конкурс эксперыментальнага кіно і відэаарту і заўсёды любімая праграма відэакліпаў.

Жанчыны ў балканскім кіно, фільмы пра нянавісць, карціны з Каўказа, кароткаметражкі ў жанры sci-fi, афрашорты, работы членаў асноўнага журы — гэта пазаконкурс ці хутчэй яго частка. А цяпер уявіце, што апроч звычайных залаў з мяккімі крэсламі і «праносіць напоі забаронена» (хоць, здаецца, можна было) фільмы паказваюцца ў кайфовых прасторах з барнай стойкай і пэўным хаосам перамяшчэнняў, у тым ліку ноччу, у тым ліку замест сняданку, альбо ў палацы Браніцкіх, адной з галоўных славутасцяў Беластока.

Прадстаўленне беларускай праграмы.

І яшчэ — Żubroffka падкрэслівае сваю мадэрновасць праз скіраванасць на доўгія ночы: праграма канцэртаў з'яўляецца асобнай гісторыяй, дыджэі, каб зрабіць вечарыны незабыўнымі, прыязджаюць у горад пачкамі, а адзін з іх — Янус Расмусэн — выступіў у якасці «тапёра» на паказе дацкай нямой карціны Хольгера-Мадсэна «Падарожжа на Марс» 1918 года ў якасці фільма адкрыцця. Беласток на фестывалі танцуе.

U

У асобнай праграме лакальнага кіно, то-бок гэтым разам у чатырох карцінах, што маюць дачыненне да Падляшша, можна было пачуць беларускую мову. Падборка паказвалася ў асаблівым і, што было відавочна, прыцягальным фармаце кінасняданку, якіх на фестывалі было тры (апроч падляскага славацкія і чылійскія кухня і фільмы) — вось табе пажытак для розуму і вось для цела. То-бок адмыслова прыгатаваныя запрошанымі кухарамі стравы прадстаўляюцца таксама, як уласна кіно, падчас першага Q&A нават прагучаў жарт, маўляў, чым больш пытанняў аўтарам, тым далей ад страў, таму пытанняў больш не было.

У гэтай праграме апроч беларускай мовы я знайшла цудоўна мілы фільм пра зніклую прафесію. Малады хлопец прыходзіць да жыхаркі пэўнай вёскі і прапануе свае паслугі спевака для курэй, быццам яны праз гэта пачынаюць несці больш яек.

З альбомамі песень — вельмі прадстаўніча — ён прапануе прадэманстраваць сваю карысць і ідзе ў куратнік, дзе пры выключаным святле выступае быццам перад публікай: звяртаецца да курачак, прадстаўляе свой рэпертуар і выконвае папулярныя песенькі. Ён пакідае жанчыне візітоўку, а пазней вяртаецца, каб незаўважна падкінуць у куратнік куплёных яек. На наступны дзень разам з гаспадыняй яны ідуць ацэньваць вынік працы, бачаць відавочны рост «вытворчасці», жанчына прапануе спеваку заплаціць яйкамі, ён збірае свае яйкі назад і сыходзіць. Цітры «Курынага спевака» Херманаса дэ Чамука інфармуюць, што ў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў рэгіёне працавала некалькі дзясяткаў прадстаўнікоў гэтай прафесіі.

Тут жа ціхая карціна «Кветка адной ночы» Наты Шады пра дзяўчыну, якая жыве наводшыбе пад строгай апекай веруючай маці, а ўрэшце дазваляе сабе маленькую вольнасць — сыходзіць на ўсю ноч да вогнішча на беразе і, нягледзячы на матчын гнеў, застаецца на заўсёды ўсцешанай глытком свабоды. Кароткаметражка «Андына» Томаша Слівінскага робіць сваім героем уладальніка рэдкага захворвання і іграе яго Барташ Беленя, што выканаў галоўную ролю ў нашумелым «Божым целе» Яна Камасы (паказваўся на кінафестывалі «Лістапад»). Żubroffka прадстаўляе праграму падляскага кіно кожны год і выдае гэтую падборку на дысках.

B

Беларуская анімацыя — «Найлепшае месца на свеце» Ірыны Тарасавай і «Паданне пра гуслі» Таццяны Кубліцкай былі паказаны ў конкурсах для дзяцей (яны ж, між іншым, удзельнічалі ў Нацыянальным конкурсе сёлетняга «Лістапада»). Але апроч гэтага 14-я Żubroffka вылучыла калекцыю беларускіх фільмаў апошніх гадоў у асобную пазаконкурсную праграму. З гэтай нагоды можна згадаць яшчэ адзін асаблівы фармат кінафестывалю — «гастролі». Пэўныя праграмы апроч уласна Беластока паказваюцца ў гарадках і мястэчках рэгіёна, якія часам выступаюць як ініцыятары, запрашаюць, сустракаюць і небяспечна адпраўляюць назад гасцей, што мусяць прэзентаваць работы і адказаць на пытанні публікі.

Гастралявала і падборка «Беларусь па-за...» — знаёмы, што яе прадстаўляў, вярнуўся з паездак з торбай падораных яму польскіх пірагоў сэнкачаў. У секцыю ўвайшло пяць нашых фільмаў, напрыклад, паўгадзінная знятая адным планам стужка Віктара Красоўскага «Душы мёртвыя», што паказвае прадпрыемства, на якім працуюць людзі з абмежаванымі магчымасцямі, і дырэктара, які хоча замяніць іх «паўнавартаснымі» супрацоўнікамі, захаваўшы плюшкі ад дзяржавы.

Узнагароджванне фільмаў на цырымоніі закрыцця. Журы зачытвае матывацыю.

Кароткаметражка «Сапраўдная амерыканка» Дар'і Жук, знятая яшчэ да знакамітага «Хрусталя», паказвае дзяўчыну з постсавецкай краіны, што прыехала па абмене ў амерыканскую сям'ю і сустрэлася з пэўнымі да сябе патрабаваннямі, якія выклікалі маленькі, але прыгожы бунт. У фільме «From a great height» Улады Сянькавай (назва пазычаная ў песні гурта Radiohead) у цягніку сустракаюцца бежанец і хлопец, што хоча пазбегнуць службы ў арміі, — абодва спадзяюцца перасячы мяжу паміж Беларуссю і Польшчай.

Куратар праграмы Радак Дамброўскі кажа, што Żubroffka даўно мела ідэю паказаць сучасныя беларускія фільмы, але яшчэ дзесяць гадоў таму сабраць праграму кароткага метра з Беларусі было даволі цяжкай задачай. Сёння ж праблема ўжо не ў недахопе, а ў раздоллі, калі можна і трэба выбіраць, і глядзіце — усё скрозь незалежнае кіно. У прыемных планах арганізатараў — паказваць праграмы беларускіх фільмаў пад брэндам Żubroffka і надалей, нават па-за межамі снежаньскіх дзён, калі праходзіць сам фестываль.

R

Я працавала ў журы. З гэтай нагоды раю пазначыць сабе прынамсі два фільмы: як толькі яны стануць даступныя ў сеціве ці дзе яшчэ, націскайце «Play». Фокусам замежных кінакрытыкаў на фестывалі стала студэнцкае і незалежнае польскае кіно і журы не абышло ўвагай амаль што відавочнага фаварыта польскіх праграм — супер кранальную, смешную і фактурную дакументальную стужку аб эвалюцыі свядомасці і прыняцці блізкага чалавека «Безумоўная любоў» Рафала Лысака. Работа між іншым прымала ўдзел у кінафестывалі IDFA ў Амстэрдаме (які называюць «дакументальнымі Канамі»).

Мы маем унука, уласна рэжысёра карціны, і бабулю, якую той час ад часу наведвае. Яны любяць адно аднаго, бабуля з нецярпеннем чакае візітаў Рафала, гарачыя абдымкі захлынаюць пяшчотай, але ў пэўны момант, пасля мільёнаў традыцыйных бабуліных жартаў і намёкаў на дзяўчат, сям'ю і будучыню, хлопец прызнаецца, што аддае перавагу мужчынскаму полу.

Усё. Сэрца бабулі разбіта, яна драматычна плача і наракае на Бога за тое, што ён адбірае ў яе самае дарагое, спрабуе пераканаць унука і перарабіць, але цягам фільма змяняецца і любоў — безумоўная любоў — бярэ верх. Карціна між тым атрымала Гран-пры кінафестывалю Żubroffka, а таксама Прыз глядацкіх сімпатый. Не дзіўна, бо Рафалу Лысаку, па першае, надзвычай пашанцавала з маляўнічай бабуляй, якая не баіцца камеры, не змяняе пад яе позіркам жэстаў і слоў, даволі камічна для сучаснага чалавека разважае і сябе паводзіць. Да таго ж гэта цэласны, паслядоўны, поўны тэм і кірункаў фільм, ды на актуальную, амаль што трэндавую, тэму, і атрымаў ён ад нашага журы Special mention.

«Дождж».

Уладальнікам жа галоўнага прыза міжнароднага журы журналістаў стаў, здавалася б, просты, а ў той жа час складаны анімацыйны фільм «Дождж» Пётра Мільчарэка. Няхітрая, але як бы канцэптуальная, мінімалістычная, геаметрычная анімацыя вымалёўвае «асляпляльны шлях да смерці», а дакладней, прагу свабоды і бяздумных прыгодаў з надзеяй на вельмі нетрывалую падстрахоўку.

Мы бачым хмарачос і чалавека, што вырашыў скончыць жыццё самагубствам, але аказаўся выратаваны супергероем. Адчуць асалоду падзення і быць выратаванымі захацела занадта шмат чалавек... «Дождж» — лёгкі фільм, але пры ўсёй сваёй забаўнасці і мінімалізме ўмяшчае ў сабе якасную іронію, правакацыйнае бачанне сучаснага свету і чалавечай прыроды і мноства магчымасцяў для паралеляў, дзе ўсё скажа адно — «чалавеку досыць складана дапамагчы».

Уласна безумоўнасцю пачуццяў і авантурнай чалавечай сутнасцю, а гэта, можа быць, самыя прыемныя з'явы на свеце, Żubroffka і ўвянчалася. Значыць, калі ехаць у Беласток, то лепш, канешне, не на закупы, а на кінафестываль. Танцуем!

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
**Фота з архіва кінафестывалю.**

Асоба

## Алеся СКАРАБАГАТАЯ:

# «НЯМА МЭТЫ ПАДАБАЦЦА»

Фота Яўгена КОЛЧАВА.

**Імя мастачкі гучыць усе пяць гадоў правядзення «Асенніх салонаў», ствараючы своеасаблівую інтрыгу: няўжо беларускія гледачы зноў аддадуць перамогу Алесі? Пакуль так і было і вось у якасці пяціразовай пераможцы салона Алеся Скарабагатая атрымала права на персанальную выстаўку «Дактыласкапія» ў галерэі «Арт-Беларусь». Сярод твораў, якія можна размежаваць па перыядах, маладая мастачка і выкладчыца Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, лаўрэат нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва разважае пра тое, чаго людзі чакаюць ад творцаў:**

— Мне здаецца, цяпер не хапае шчырага і высокапрафесійнага мастацтва, шмат спекуляцый, калі мастакі хочуць утварыць фурор праз шокавае ўздзеянне. Часта робяць штосьці агрэсіўнае, каб прыцягнуць да сябе ўвагу. Гэта можа здзівіць адзін раз, два разы — яшчэ пройдзе, а потым стамляе. Наогул у мяне няма мэты падабацца, больш важна, каб падабалася мне самой.

**— Стыль, які вы абралі, апелюе да гісторыі мастацтва, калі цанілася менавіта ўменне маляваць. Цяпер шмат змянілася ў разуменні мастацтва. Чым вы кіраваліся, калі выбіралі гэты кірунак?**

— Гэта тое, што мне блізка. Апошнім часам я захапілася эпохай Адраджэння, вельмі падабаецца Ван Эйк. Калі была ў Аўстрыі, уразілася творамі Брэйгеля. Магчыма, гэтыя захапленні ўплываюць на маю стылістыку.

**— На такую дакладную прамалёўку, відаць, ідзе шмат часу?**

— Так, часу ідзе шмат. Бывае, што над адной работай працую паўгода. Часам я спрабавала зафіксаваць, колькі часу ідзе на маленькі кавалак 10 на 10 ці 5 на 5 сантыметраў — бывала, што ўвесь дзень. Але я атрымліваю эстэтычнае задавальненне і ад працэсу працы, і калі бачу вынік.

...Спачатку прыходзіць ідэя, потым я гляджу, як яе рэалізаваць у жывапісе. Ідзе работа над эскізамі, над кампазіцыяй, сама назва можа прыйсці адразу, можа — у працэсе, а можа і напрыканцы. Усё пачынаецца з ідэі, з думак.

**— А ідэя стаць мастаком як да вас прыйшла?**

— У дзяцінстве. У маёй сям'і мастакоў няма. Мама заўсёды хацела маляваць, але так склаўся лёс, што ў яе не атрымалася. Яна шэф-кухар — таксама ў нейкім сэнсе займалася мастацтвам. Але сваё жаданне яна рэалізавала, калі выйшла на пенсію, з'явіўся час — нават выстаўку зрабіла. А ў дзяцінстве яна накіроўвала і майго старэйшага брата, і мяне ў гэты бок. Не прымушаючы, ціхенька. Мне спадабалася — і ўсё склалася.

**— Ці не пад уплывам мамы ў вас ёсць жаданне пісаць стравы? Вельмі натуральныя вашы «Парыжане», па сале адразу пазнаеш Беларусь...**

— «Парыжан» я прывезла з Парыжа. Гэта рэальныя парыжскія багеты. На мяжы на мяне глядзелі са здзіўленнем, калі гэтыя два батоны тырчалі з торбы. А я іх везла ў Беларусь, каб тут намаляваць.

**— Вось што возяць мастакі з Парыжа... Але ж у вас там была выстаўка. Якое было адчуванне ад зносін з іншай мастацкай рэальнасцю?**

— Еўрапейцы, на мой погляд, ужо звыкліся з тым, што мастацтва больш няма. Яны глядзелі са здзіўленнем, таму што не разумелі, як такое можна зрабіць рукамі? Перапытвалі, ці не друк, ці не схаваныя друкаваныя аркушы пад слоем фарбы. Але іх прыцягвала — такога мастацтва ў іх бадай што няма. Бо калі так пойдзе далей, то мастацтва наблізіцца да вынішчэння, і тады спатрэбіцца новае Адраджэнне. Пра гэта дзве мае работы з апошняга «Асення-га салона» — «Уласцівасці часу»: са слою пылу праглядаюць вобразы каштоўнасцяў. У тым ліку ў мастацтве — тое, чаго нельга згубіць. Мы крыху адстаём ад еўрапейскіх тэндэнцый, але ўжо адчуваецца іх уплыў.

Пакуль мы ў нейкім сэнсе існуём на кантрасце — яшчэ захавалі выяўленчую школу. А можа новае Адраджэнне пачнецца з Беларусі, з тых краін, дзе захавалася мастацкая школа? Бо калі яна зусім памрэ, то адраджэнне немагчымае.

**— Калі нашы мастакі сёння глядзяць на Захад, то прымяраюцца: ці не знойдзецца ім месца ў той сістэме, дзе ім лягчэй было б вырашыць свае жыццёвыя пытанні. Вас такія думкі абмінулі?**

— Магчыма і лягчэй, але мне не хацелася б нікуды з'язджаць. Я паўгода пражыла ў Польшчы, прычым там блізкія нам па менталітэце людзі, але мне было не камфортна. У Беларусі — дома, тут больш прыемна жыць, кантактаваць з людзьмі.

**— Быць мастаком у Беларусі — ганарова ці складана?**

— Складана, як, напэўна, паўсюль. Гэта псіхалагічна складана — ты не ведаеш сваёй будучыні. І матэрыяльна складана: па вялікім рахунку прафесія не прадугледжвае сталай работы з рэгулярным заробкам. Штосьці прадаць не заўсёды і не ва ўсіх атрымліваецца.

**— Таму нашы мастакі звычайна скардзяцца на адсутнасць арт-рынку?**

— Да «Асенняга салона» ў нас наогул не было выставак з цэннікамі. Людзі даведаліся, колькі каштуе мастацтва. Таму што дагэтуль было ўяўленне пра цэны работ толькі па салоне на галоўным праспекце сталіцы. «Асенні салон» паказаў больш шырока палітру айчыннага мастацтва. Мне здаецца, з гэтага пачынаецца арт-рынак: калі чалавек ведае, колькі грошай ён гатовы аддаць за карціну, а колькі не можа.

**— А з чаго складваецца цана на мастацкі твор? Калі мастакі яе выстаўляюць, што маюць на ўвазе: ідэю, матэрыялы, укладзены час?**

— Матэрыялы, вядома, таксама. Але іх кошт неістотны, нават пры тым, што я выкарыстоўваю дарагія матэрыялы. Для мяне больш істотны час, які затрачаны на работу. Праўда, на пейзаж я не магу паставіць высокую цану, нават калі ён добра атрымаўся. Бо акрамя таго, што ўсе могуць назіраць вакол, ёсць яшчэ думка, ідэя, якую хочацца данесці. Магчыма, на цану ўплывае і таксама нешта суб'ектыўнае, зразумелае толькі самому мастаку. Глядач можа бачыць дзве падобныя работы — па ўзроўні, па памеры, а для мастака адна будзе даражэйшая за другую. І гэта немагчыма растлумачыць. Але ж ніхто не прымушае купляць, калі для чалавека дорага. Бывае, што шмат хто хацеў бы купіць, таму і злуецца, што высокі кошт...

У маім выпадку людзям проста падабалася і ўзнікала жаданне купіць. Праўда, яны не думалі, што гэтыя работы будуць каштаваць дорага. Часта хочуць купіць тое, што я нават і не думала. Так і атрымліваецца: калі пішаш, не думаючы аб продажы, гэта і купляюць, незалежна ад цаны. Таму я проста пішу, што хочацца.

Бывае, што мастацтвазнаўцы дапамагаюць складаць калекцыі заможным людзям, якія маюць разлік укласці грошы такім чынам. Мне падаецца, што такія работы будуць ляжаць у калекцыях вельмі доўга, і іх яшчэ не хутка пакажуць ці перапрададуць даражэй, як гэта адбываецца на рынку мастацтва.

*(Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by)*

**Гутарыла Ларыса ЦІМОШЫК.**

На сцэне

# ПРЭТЭНЦЫЁЗНЫ НУАР, ДЫЯЛОГ І ТАНЕЦ

## Тры розныя стылі ў спекталі «Arche&Ket» паказваюць эвалюцыю кахання

**Асноўны міф свету разбіваецца аб безнадзейныя скалы новай ва ўсіх сэнсах пастаноўкі «Arche&Ket», што расказвае пра вялікае каханне, але не можа яго, ужо мёртвае, адрадзіць. Прэм'ерныя паказы завяршыліся 27 і 28 лістапада ў Ок16. Гэтым разам праект «Т.О.К.» узяўся за п'есу грузінскага драматурга Дзімітрыя Учанеішвілі, а рэжысёр Антон Макуха і харэограф Ірына Шырокая зрабілі спектакль з відэарада і танца. Праз абрывачныя фразы, стыльную чорна-белую здымку і пачуццёвыя целарухі глядач сочыць за каханнем, якое спачатку гарыць агнём, а ўрэшце знікае, нягледзячы на ўсе намаганні яго вярнуць.**

Фота Ганны ШАРКО.

Пастаноўка прыцягнула нашу ўвагу не толькі сама па сабе і не толькі любоўнымі перыпетыямі, але ў першую чаргу кантэкстам, з якога паходзіць «Arche&Ket». Гэта мадэрновы беларускі тэатр, што спрабуе намацаць новы ці прынамсі незвычайны для гэтай прасторы спосаб выказвання, адыходзіць ад акадэмічных канонаў, задзейнічае відэа і харэаграфію, займае альтэрнатыўную сцэну і пераключае гледача на іншую хвалю ўспрымання твора.

Пакуль тэма пэўнай традыцыйнасці беларускай тэатральнай сферы запаўняе эфір, працэс між тым ідзе: пастаноўкі, у прыватнасці, Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн», што арганізаваў праект «Т.О.К.», ужо вызначыліся са сваімі прэферэнцыямі. Пошукі іншай мовы за невялікія бюджэты добра глядзяцца ў прасторы Ок16, якая прапануе новы спосаб глядзець спектакль і дазваляе ўбачыць, наколькі разнастайнымі і вытанчанымі могуць быць метады перадачы сэнсаў.

«Arche&Ket» не моцна і вытанчаны (вытанчаная тут харэаграфія), але прынамсі для нашага гледача незвычайны. Сцэна — не сцэна. Акцёрамі, што адчуліся б на дотык, з'яўляецца пара танцораў: целарухамі Яўген Іваноў і Ганна Сачыўка перадаюць альбо нават паўтараюць, проста іншым шляхам, тое, што агучваецца з экрана.

А на экране два партрэты — закаханых, што перагаворваюцца і праз дыялог раскрываюць даволі схематычны сюжэт, іграюць Аляксандр Яфрэмаў і Крысціна Жаўрыд. У пачатку спектакля яны любяць адно аднаго, потым жывуць у бягах, але з аптымізмам, праз абставіны мусяць расстацца, мінае сем гадоў, Arche вяртаецца да Ket, абодва ўсведамляюць, што каханне прайшло, спрабуюць яго ўваскрасіць, нарэшце, прызнаюць паразу — усё.

У асобным нуарным стылі, з жартамі-прыгаворкамі, створаны скошаны і небяспечны свет двух следчых, што гадамі ідуць за каханкамі і выконваюць ролю тых абставін, якія зводзяць моцнае пачуццё на не, і знікаюць, калі выправіць страту ўжо немагчыма. Гэта паралельная, зноў віртуальная, недатыкальная, гісторыя на экране, і яна падкрэслена іншая — вы павінны заўважыць, у якіх колерах і праз якія дэталі перадаецца свет галоўных герояў і што кажа пра двух следчых іх даволі кінематаграфічнае атачэнне. У выніку спектакль складаецца не з відэа і танца, а з двух розных відэа і танца: паколькі аўтары з пункту гледжання стылю не прыводзілі экранныя гісторыі да агульнай роўніцы, нуар пра следчых становіцца трэцім паўнавартасным творам унутры твора, і гэтая рознасць эстэтык абагачае даволі мінімалістычны спектакль. Праўда, і мінімалізм, калі перад табой даволі шматслоўны пачуццёвы танец, становіцца ўмоўным: усё пачалося з класічных рухаў, а працягнулася экспрэсіўнай харэаграфіяй, здольнай трансляваць гісторыю нават не ў якасці дапаможніка, але амаль што самастойна.

Хоць логіка падзей непазбежна прыводзіць да паразы былых закаханых, здаецца, галоўнае ў тым, што пачуццё было, нездарма яно становіцца галоўным героем: «Arche&Ket» пачынаецца і канчаецца на моманце безумоўнага кахання, а гэта пры ўсіх сумных спадарожніках не вельмі песімістычнае. Параўнанне недакладнае, але ўспамінаецца фантастычны фільм «Прыбыццё» Дэні Вільнёва, дзе галоўная гераіня ў выкананні Эмі Адамс ведае, што яе дачка памрэ падлеткам, але ўсё роўна ідзе на боль, каб толькі прабыць з ёй адмераныя гады. Вось гэтыя пражыванне, наяўнасць, валоданне, з усімі стадыямі і сумнымі пераходамі, хоць у асноўным, рэгрэсам і ўгасаннем, становяцца прадметам аповеду ў «Arche&Ket».

Сумяшчэнне вонкава сумнага выніку і невідавочна шчаслівага падтэксту магчымае праз дэталь на завяршэнне спектакля, у якой усё замыкаецца на пачатку, на тым даўнім абсалюце, на безумоўных вартасцях. Але ў гэтым выпадку жаданы пункт адліку немагчымы без журботнай гісторыі, што за ім настала. І тут ужо час вызначыць свае прэферэнцыі — быць альбо не быць.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

## Песню бярыце з сабою...

# ДАРАГАЯ

Пятро Глебка (1905—1969) — паэт, драматург, перакладчык, арганізатар навукі. Працаваў у Інстытуце літаратуры, мовы і мастацтва Акадэміі навук БССР, узначальваў групу па складанні «Руска-беларускага слоўніка». Кіраваў Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Быў акадэмікам-сакратаром Аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Удзельнічаў у рабоце сесій Генеральнай Асамблеі ААН.

**Вершы — Пятро ГЛЕБКА.**
**Музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

***Куплет 1:***
За гаем сонца патухае,
З-за гор выходзіць маладзік.
Дзяўчына любая чакае
Мяне ў прысадах маладых.

***Прыпеў:***
Гнуцца вербы, гнуцца нізка,
Гнуцца аж дадолу...
Дарагая, сядзь жа блізка,
Раскажы пра долю.
Я вачэй тваіх праменні
Пад нябесны колер
Расцалую: можа, меней
Будзе ў сэрцы болю.

***Куплет 2:***
Адзін выходжу на дарогу,
Буйное жыта ледзь шуміць,
Ды насцярожана і строга
З-за хмаркі месячык глядзіць.

***Прыпеў***

***Куплет 3:***
Маўчаць высокія бярозы,
Маўчаць туманныя палі.
І вось мой твар шчыкочуць косы,
І рукі шыю абнялі...

***Прыпеў***

**Рубрыку вядзе Яўген КСЯНЕВІЧ.**
evgenyksenevich@gmail.com




## Ну і ну!

### Нявеста не дачакалася жаніха і выйшла замуж за іншага

**Дзяўчына з індыйскага горада Біджнор, штат Утар-Прадэш, не дачакалася на вяселлі жаніха і выйшла замуж за іншага мужчыну, паведамляе сайт News 18.**

За шэсць тыдняў да інцыдэнту пара адсвяткавала неафіцыйнае вяселле, але дзяўчына не пераязджала ў дом жаніха. Паміж сем'ямі закаханых былі рознагалоссі. Сваякі жаніха пастаянна патрабавалі пасаг, у тым ліку ровар і грошы, якія сям'я нявесты не збіралася аддаваць. У выніку сваякі нявесты збілі гасцей з боку жаніха і замкнулі іх у пакоі на месцы правядзення вяселля. Абедзве сям'і звярталіся ў паліцыю, але ў выніку памірыліся. Апошняй кропляй стала спазненне жаніха на афіцыйнае вяселле. Замест таго, каб прыехаць у прызначаны час, ён прыбыў пазней, што вельмі раззлавала нявесту і яе сям'ю. У выніку дзяўчына адмяніла шлюб і выйшла замуж за іншага маладога чалавека ў прысутнасці старэйшын вёскі.

### Прарочы сон прынёс мужчыну багацце

**На амерыканскім востраве Драманд, штат Мічыган, мужчына даверыўся снам і сарваў у латарэю буйны куш, паведамляе партал UPI.**

23-гадовы Джэсі Фравала сцвярджае, што яму тры разы сніўся сон, у якім ён выйграваў у адной імгненнай латарэі 500 тысяч долараў. Мужчына палічыў сны, якія паўтараліся, прарочымі і стаў рэгулярна купляць білеты гэтай гульні. «Я пачаў гуляць у гульню са сну ўжо пасля першага сну, — прызнаецца Фравала. — Я спадзяваўся, што мае сны стануць рэальнасцю». Самае цікавае, што ў выніку ўдачлівы амерыканец сапраўды сарваў джэкпот у 500 тысяч! «Я не мог у гэта паверыць і нават заплакаў, — успамінае ён. — Выйгрыш і праўда адбыўся, як у сне». Ён плануе купіць новую машыну, а астатнюю частку прыза інвеставаць.

**Іван КУПАРВАС.**

## Даты | Падзеі | Людзі

**14 СНЕЖНЯ**

У краіне

**1906** год — у Мінску было заснавана беларускае кніжна-выдавецкае таварыства «Мінчук» (дзейнічала да 1907 года). Менавіта ім быў падрыхтаваны да друку першы зборнік паэзіі Янкі Купалы «Жалейка».

**1949** год — нарадзілася Тамара Міхайлаўна Тузава, беларускі навуковец, доктар філасофскіх навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па праблемах анталогіі свядомасці, свабоды і адказнасці чалавека, тэорыі і метадалогіі гуманітарнага пазнання.

**1954** год — нарадзіўся Анатоль Паўлавіч Пашкевіч, беларускі вучоны ў галіне робататэхнікі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па метадах і алгарытмах шматкрытэрыяльнага сінтэзу маніпуляцыйных і кіроўных сістэм прамысловых робатаў.

**1963** год — рабочаму пасёлку Полацкі, які ўзнік у 1958-м у сувязі з будаўніцтвам Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, быў нададзены статус горада абласнога падпарадкавання з назвай Наваполацк.

**1984** год — створаны Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей. Яго першымі экспанатамі сталі карціны мастакоў, ураджэнцаў раёна. У музеі праходзяць выстаўкі мастацкіх твораў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У свеце

**1789** год — нарадзілася Марыя Шыманоўская, віртуозная польская піяністка і кампазітар. Памерла ў 1831 годзе.

**1884** год — нарадзіўся Антоній Васілевіч Флароўскі, рускі і чэшскі гісторык-славіст. Аўтар прац па гісторыі Расіі і ўзаемаадносін Чэхіі з усходнімі славянамі, у тым ліку беларусамі («Чэхі і ўсходнія славяне»). Даследаваў творчую спадчыну Ф. Скарыны. У 1967-м наведаў Беларусь і прыняў удзел у сесіі АН Беларусі, прысвечанай 450-годдзю беларускага кнігадрукавання. Памёр у 1968 годзе.

**1909** год — нарадзіўся Уладзімір Саламонавіч Палякоў, расійскі пісьменнік, сцэнарыст, эстрадны драматург. Працаваў у Ленінградскім тэатры мініяцюр разам з Аркадзем Райкіным, стварыў і кіраваў Маскоўскім тэатрам мініяцюр. Памёр у 1979 годзе.

**1911** год — нарвежскі палярны даследчык Руаль Амундсен першы дасягнуў Паўднёвага полюса Зямлі, на месяц апярэдзіўшы англійскую экспедыцыю Роберта Скота. Агледзеўшыся, Амундсен канстатаваў: «Неверагодна плоская раўніна».

**1924** год — нарадзіўся Радж Капур, індыйскі акцёр, рэжысёр, прадзюсар, сцэнарыст. Пастаноўшчык і выканаўца галоўнай ролі ў фільмах «Бадзяга», «Пан 420». Зняў фільмы «Санг», «Маё імя клоўн», «Бобі». Памёр у 1988 годзе.

**2004** год — па ініцыятыве Уга Чавеса і Фідэля Кастра створаны Баліварыянскі альянс для народаў нашай Амерыкі. У гэты ж дзень у Францыі ў горадзе Міё над далінай ракі Тарн адкрыўся падвесны мост, які лічыцца самай высокай у свеце падобнай канструкцыяй.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.21 | 16.47 | 7.26 |
| Віцебск — | 9.18 | 16.29 | 7.11 |
| Магілёў — | 9.11 | 16.37 | 7.26 |
| Гомель — | 8.59 | 16.42 | 7.43 |
| Гродна — | 9.35 | 17.04 | 7.29 |
| Брэст — | 9.27 | 17.13 | 7.46 |

## Месяц

***Поўня 12 снежня.***
***Месяц у сузор'і Рака.***

## Імяніны

***Пр.*** *Навума.*
***К.*** *Альфрэда, Ізыдара, Яна.*

Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Вельмі хочацца гарбаты з каньяком, але каб без гарбаты.**

Яна і ён.

— Каханы, скажы, вось чаму ты са мной ажаніўся?

— Дурань быў.

— А чаму не разводзішся?

— Таму што іншай такой дурніцы не знайду.

**Вельмі цяжка быць адзінокай жанчынай. Даводзіцца самой на сябе крычаць за тое, што валасы забілі вадасцёк.**

У краме.

— А што ў вас вось гэты тваражок такі дарагі, нібыта з малака зроблены?..

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае міністэрствам інфармацыі рэспублікі беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

прыём рэкламы
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4269.
Нумар падпісаны ў 19.30 13 снежня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12